Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 СНЕЖНЯ 2008 г. СЕРАДА № 238 (26351)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.




Фота БЕЛТА.

## «Руплівасць і беражлівасць становяцца асновай эканамічнай палітыкі»

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пабываў з рабочым візітам у Мінскай вобласці і ўзяў удзел у цырымоніі пуску прыроднага газу ў Беразіне. З'яўленне цэнтральнага газазабеспячэння ў гэтым горадзе завяршыла працэс газіфікацыі райцэнтраў у нашай краіне. Разам з тым у бліжэйшы час запланавана зрабіць яшчэ шмат, каб прыродны газ дайшоў да кожнага канкрэтнага спажыўца.**

Газіфікацыя ўсіх 118 раённых цэнтраў рэспублікі, заўважыў кіраўнік дзяржавы, была нялёгкай справай. Упершыню газ прыйшоў у краіну ў 1960 годзе, калі быў уведзены ў эксплуатацыю магістральны газаправод «Дашава — Мінск». Прычым у савецкія часы ў асноўным газіфікаваліся толькі тыя населеныя пункты, што прылягалі да трасы магістральнага газаправода, паколькі будаўніцтва і эксплуатацыя газаправодаў — справа няпростая і дарагая. Натуральна, гэта не спрыяла раўнамернаму развіццю рэгіёнаў, асабліва малых гарадоў і вёсак, што негатыўна адбівалася і на дабрабыце іх жыхароў. «Таму, — падкрэсліў Прэзідэнт, — намі была пастаўлена мэта — газіфікаваць усю краіну. Вырашэнне гэтай задачы запатрабавала ад нас неймаверных намаганняў, таму што пасля развалу Савецкага Саюза эканоміка краіны знаходзілася ў глыбокім крызісе. Не хапала фінансаў, тэхнікі, іншых рэсурсаў». Тым не менш, нягледзячы на ўсе складанасці, неабходныя рэсурсы былі знойдзены, і ўжо з 1995 года рэспубліка прыступіла да інтэнсіўнай газіфікацыі.

Перш за ўсё, нагадаў Аляксандр Лукашэнка, гэтыя работы былі разгорнуты ў палескім рэгіёне, найбольш пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Людзі, што там пражывалі, асабліва мелі патрэбу ў экалагічна чыстым паліве. Да таго ж, заўважыў ён, былыя ўлады шмат часу абяцалі газіфікаваць Палессе, стварыць дастойныя ўмовы жыцця для людзей. Аднак не ажыццявілі гэтага. «Таму гэтыя планы давялося рэалізоўваць нам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паралельна праводзілася газіфікацыя на Магілёўшчыне, Міншчыне, у Гродзенскай і Віцебскай абласцях, што дазволіла за 14 апошніх гадоў пракласці болей за 21 тысячу кіламетраў газаправодаў з 36 тысяч, якія сёння знаходзяцца ў эксплуатацыі па краіне ў цэлым.

Паводле словаў кіраўніка дзяржавы, спажыўцамі «блакітнага паліва» сталі мільёны нашых грамадзян, тысячы прамысловых, сельскагаспадарчых і сацыяльных аб'ектаў. Толькі ў Мінскай вобласці газам забяспечаны 38 гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу, 394 сельскія населеныя пункты. За 2007—2008 гады са звадкаванага на прыродны газ у Мінскай вобласці пераведзеныя амаль 10 тысяч кватэр. Прэзідэнт адзначыў, што магутным імпульсам газіфікацыі сельскай мясцовасці стала рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Не так даўно пабудаваныя і ўведзеныя ў эксплуатацыю падводныя газаправоды да гарадскога пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна, трох аграгарадкоў Пухавіцкага, Смалявіцкага, Салігорскага раёнаў. Да канца года прыродны газ атрымаюць жыхары яшчэ шасці населеных пунктаў. Прыродны газ прыйшоў у курортны пасёлак Нарач, што дапаможа, на думку Прэзідэнта, развіццю інфраструктуры турыстычнай галіны перспектыўнага рэгіёна. У цэлым, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, на газіфікацыю Міншчыны прадугледжана накіраваць да 2011 года амаль 40 млрд рублёў, што дазволіць газіфікаваць у аграгарадках вобласці 10 тысяч кватэр.

Кіраўнік падзякаваў усіх удзельнікаў будаўніцтва газаправоду за тое, што яны выканалі яго даручэнне, дадзенае некалькі гадоў таму, і зрабілі ўсё, каб парадаваць жыхароў Беразіно. «Яны працавалі сумленна, — сказаў Прэзідэнт. — Таму што газапровод будаваўся ў складаных умовах, давялося пераадолець лясныя масівы і балоты, змайстраваць 33 пераходы цераз аўтадарогі і водныя перашкоды». У выніку ў горадзе са звадкаванага на прыродны газ будуць пераведзеныя больш за дзве тысячы кватэр. У бліжэйшы час мяркуецца газіфікацыя яшчэ дзвюх тысяч індывідуальных дамоў.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## Газавы кантракт будзе падпісаны да канца года...

Ёсць ацэнкі і разлікі, што прыродны газ па меншай меры да 2025 года будзе заставацца самым танным і экалагічна бяспечным відам паліва, паведаміў журналістам у Беразіне першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка.

Трэба разумець, падкрэсліў ён, што калі будзе даражэць газ, то будзе расці кошт і астатніх энерганосьбітаў. Каментуючы сітуацыю вакол заключэння кантракта з Расіяй па пастаўках газу налета, Уладзімір Сямашка праінфармаваў, што гэтая тэма абмяркоўвалася на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў ЕўрАзЭС, пасля сустракаліся прэм'еры Беларусі і Расіі. «Бакі абазначылі свае падыходы, і ёсць разуменне таго, што трэба вырашаць гэтую праблему, таму што ствараецца парадаксальная сітуацыя», — заўважыў Уладзімір Сямашка. Ён патлумачыў, што сусветны кошт на нафту за апошні час знізіўся ў 3,5 раза. «Мець у гэтай сітуацыі больш як двухразовае павелічэнне кошту на газ было б парадаксальна», — лічыць першы намеснік прэм'ера. Паводле яго меркавання, да канца года пытанне з заключэннем кантракта па газе будзе вырашана.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Дызельнае паліва для АПК — зялёнае, аўтабензін — сіні

Для сельскагаспадарчых арганізацый і іншых структурных падраздзяленняў, якія выконваюць работы, звязаныя з вытворчасцю сельгаспрадукцыі, дызельнае паліва будзе пастаўляцца афарбаваным у зялёны колер, а аўтамабільны бензін — «Нармаль-80» — у сіні. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 1917, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў. Яна ўступае ў сілу праз 10 дзён пасля афіцыйнага апублікавання.

У розніцы такое паліва прадавацца не будзе. У галоўным упраўленні адзначылі, што фарбаванне дызельнага паліва і аўтабензіну прымяняецца з мэтай прадухілення масавага крадзяжу ГЗМ. Таму работнікі міліцыі будуць мець права праверыць, напрыклад, якім палівам запраўлены той або іншы прыватны аўтамабіль.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

***Ідзе падпіска на І паўгоддзе і І квартал 2009 года***

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 | 60720 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 | 57420 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 | 97020 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 | 88440 |

# ЖЫЛЛЁ ПАДАЕ. У ЦАНЕ

**Тэмпы зніжэння коштаў на нерухомасць у сталіцы ўжо апярэджваюць паказчыкі 1999—2000 гадоў. У бліжэйшыя месяцы кватэры будуць таннець хутчэй, і прагнозы экспертаў становяцца ўсё больш радыкальнымі. Пры эканамічных цяжкасцях яшчэ на працягу 10—12 месяцаў доларавыя кошты да канца наступнага года знізяцца на 30—40 працэнтаў. Такія прагнозы беларускіх банкіраў.**

Яшчэ месяц таму на другасным рынку 1-пакаёвая кватэра ў панэльным дзевяціпавярховіку з кухняй у 7,2 метра і пакоем каля 17 «квадратаў», напрыклад, у Фрунзенскім раёне Мінска, які ў плане жыллёвага будаўніцтва развіваецца найбольш актыўна, каштавала ад 62 тысяч. Цяпер цэннік пачынаецца з 55 тысяч. Тыя, каму трэба прадаць кватэру тэрмінова, зніжаюць кошты сур'ёзна. Паводле звестак аналітычнай беларускага партала нерухомай маёмасці **realt.by**, у апошнія два месяцы 2008 года назіраецца зніжэнне кошту як на другасным рынку нерухомасці, так і ў новабудоўлях Мінска. Асабліва адчувальна гэта адбілося ў пачатку снежня, калі частка прадаўцоў, каб прадаць нерухомасць да Новага года, знізіла кошты за тыдзень на 5—15 працэнтаў. Колькасць кватэр, прапанаваных у інтэрнэце і ў базе звестак агенцтваў нерухомасці, за кастрычнік—лістапад вырасла прыкладна амаль на 20 працэнтаў, што і тлумачыць зніжэнне коштаў. Лідарам па аб'ёме прапановы другаснага жылля ў Мінску на сёння па-ранейшаму з'яўляецца ўсё той жа Фрунзенскі раён (22 працэнты ўсіх прапаноў). Далей ідуць Маскоўскі і Савецкі раёны (14 і 12 працэнтаў адпаведна), найменш прапаноў у даўно забудаваных Кастрычніцкім і Партызанскім раёнах — каля 6 працэнтаў ад усіх прапаноў.

Кватэры ў новабудоўлях сталіцы прапаноўваюцца па камерцыйных цэнах ад 1300 да 2600 долараў за квадратны метр. За жнівень—лістапад 2008 года сярэдні кошт прапановы новабудоўляў Мінска знізіўся на 1,2 працэнта — з 1907 долараў за квадратны метр да 1885.

А за ўвесь 2008 год сярэдні кошт новабудоўляў Мінска знізіўся прыкладна на 100 долараў, або 5 працэнтаў — з 1995 долараў у студзені да 1885 — у снежні. Нягледзячы на тое, што сярэдняя цана квадратнага метра патаннела не нашмат, гэта не значыць, што ў горадзе няма танных кватэр. Аналітыкі адзначаюць, што некаторыя забудоўшчыкі, каб разлічыцца з банкамі, робяць скідкі на 200 і нават 500 долараў за квадратны метр. «Праглынуце сваю цану!» — самы папулярны сёння лозунг мінскіх дэвелапераў, спецыялістаў бізнесу нерухомасці. Дарэчы, для параўнання, за апошнія два з паловай месяцы квадратны метр у Маскве патаннеў амаль на 10 працэнтаў. Кошты на маскоўскія новабудоўлі дасягнулі свайго гістарычнага максімуму ў кастрычніку (6,54 тысячы долараў за метр), і толькі за лістапад яны знізіліся ў сярэднім на 90 долараў (без уліку элітнага жылля ў цэнтры расійскай сталіцы, дзе пакуль кватэры не таннеюць нават ва ўмовах крызісу).




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што будзе далей? Аналітыкі цэнтраў нерухомасці лічаць, што да канца лета 2009 года агульнае зніжэнне коштаў на жылую нерухомасць можа скласці 25, а то і 30 працэнтаў. Больш радыкальную інфармацыю дае агляд «Кошты на нерухомасць у свеце: надзённая дынаміка і перспектывы»: тут прагназуецца яшчэ большы абвал рынку — да 40 працэнтаў. У сувязі з крэдытнымі праблемамі (сёння, як вядома, большасць беларускіх банкаў спыніла крэдытаванне куплі жылля і выдачу крэдытаў нечаргавікам) з'явіліся ўмовы, пры якіх у Мінску можа пачацца хуткае зніжэнне коштаў, супастаўнае па сваіх маштабах з тым, якое назіралася ў 1998—99 гадах. Пры базавым сцэнарыі (гадавы прырост ВУП на 7,5-8,5 працэнта, інфляцыя каля 12 працэнтаў, курс 2367 рублёў за долар) зніжэнне коштаў складзе да канца 2009 года ў параўнанні з 3-м кварталам 2008 года: на першасным рынку 23,6 працэнта ў доларах, на другасным рынку — 36,4 працэнта.

Пры горшым развіцці падзей — стрэсавым сцэнарыі (стагнацыя ВУП, больш высокія тэмпы інфляцыі, глыбокая дэвальвацыя рубля), кошт квадратнага метра ў Мінску знізіцца ў новабудоўлях на 36,6 працэнта ў доларах, вярнуўшыся да паказчыкаў пачатку 2005 года. На другасным рынку варта чакаць скарачэння на 30,8 працэнта ў замежнай валюце.

У цэлым па Беларусі зніжэнне коштаў на нерухомасць будзе менш значным, чым у сталіцы, лічаць аналітыкі.

«Такая дынаміка коштаў, безумоўна, будзе мець негатыўныя наступствы для іпатэчнага рынку і для рынку іншых крэдытаў, у забеспячэнне якіх былі выкарыстаны аб'екты нерухомасці. Гэтая сітуацыя можа прывесці да наступнай дэстабілізацыі рынку жылля і рынку нерухомасці ў цэлым», — адзначаюць аналітыкі IRN-Центра. Дарэчы, у суседняй Расіі агучаных урадам захадаў у падтрымку іпатэкі будзе недастаткова, каб прадухіліць калапс на рынку. Фактычна іпатэчны рынак там спыніў сваё існаванне ўвосень. У нас жа іпатэка яшчэ не набрала наогул ніякіх абаротаў. Каб беларусы зноў сталі браць крэдыты на жыллё, заработная плата ў 2009 годзе павінна вырасці прыкладна на 30 працэнтаў, а кошты на нерухомасць знізіцца на 25—30 працэнтаў, што, як паказваюць розныя прагнозы, малаверагодна.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

«Прамая лінія»

## ДАЛОЎ КАМЯНІ... І ЦЫСТЫТ, І ПРАСТАТЫТ

**СЁННЯ з 14.00 да 15.00** у рэдакцыі газеты на пытанні аб прафілактыцы і лячэнні мочакаменнай хваробы, дабраякаснай гіперплазіі прастаты, нетрымання мачы, запаленчых хвароб мочапалавой сферы — прастатыту, піеланефрыту, цыстыту адкажа **загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр Уладзіміравіч СТРОЦКІ.**

***Тэлефоны прамой лініі 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.***

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### МІХАІЛ СНЯГІР УЗЯТЫ ПАД ВАРТУ

**Яшчэ 12 снежня былому пракурору Мінскай вобласці Міхаілу Снегіру прад'яўлена абвінавачанне ў злачынстве, прадугледжаным ч. 3 арт. 424 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі).**

Паводле звестак прэс-службы Генеральнай пракуратуры, Міхаіл Снягір узяты пад варту. Адносна былога намесніка генеральнага пракурора Міхаіла Купрыянава пакуль нічога не паведамляецца. Нагадаем, што інфармацыю аб дзейнасці памянёных асобаў агучыў на нарадзе, прысвечанай барацьбе з карупцыяй, Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. На нарадзе, у прыватнасці, указвалася на незаконнае набыццё Снегіром пяціпакаёвай кватэры ў цэнтры сталіцы. Купрыянаў жа садзейнічаў неправамоцным дзеянням.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ТРАГЕДЫЯ НА ПАЛІГОНЕ

Каля вёскі Дзеражня Рэчыцкага раёна вайсковая часць праводзіла вучэнні па стральбе. У час перамяшчэння ад першага да другога рубяжа радавы А.Д., які быў прызваны на службу ў армію ў ліпені мінулага года з Рагачова, спатыкнуўся і незнарок пальцам правай рукі націснуў на спускавы курок. Куля трапіла няшчаснаму ў галаву. Салдат памёр на месцы.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### АДКУЛЬ МЁД?

Каля в. Збураж, пад Маларытай, аператыўнікі зазірнулі ў «Крайслер-Вояджэр» і знайшлі там 700 кг мёду, які і канфіскавалі. Беспрацоўны з Кобрына вёз яго не са свайго пчальніка і не меў дакументаў.

А па месцы жыхарства пенсіянеркі з в. Дрочава гэтага ж раёна канфіскавалі ўжо 2,5 тоны мёду, які пацягнуў на 28 млн рублёў. Адкуль ён, жанчына растлумачыць не магла.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Беларусь і ЕС прадоўжаць дыялог

Дамоўленасць аб прадаўжэнні дыялога паміж Беларуссю і ЕС дасягнута ў ходзе рабочага візіту ў Мінск 16 снежня дэлегацыі Генеральнага сакратарыята Савета Еўрасаюза на чале з начальнікам палітычнага аддзела Хельгай Шміт. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе знешнепалітычнага ведамства Беларусі.

У час праведзеных сустрэч прадстаўнікоў Генеральнага сакратарыята Савета ЕС з намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталляй Пяткевіч і намеснікам міністра замежных спраў Валерыем Варанецкім бакі абмеркавалі стан і перспектывы адносінаў паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам.

## Вытокі і развіццё беларускай дзяржаўнасці

**18 снежня ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбудзецца Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці», прымеркаваная да 90-годдзя ўтварэння БССР.**

На канферэнцыі будзе абмяркоўвацца шырокі спектр пытанняў палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця Беларусі. Будуць працаваць секцыі «Вытокі і станаўленне беларускай дзяржаўнасці», «Эвалюцыя беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове: набыткі і праблемы», «Рэспубліка Беларусь — суверэнная дзяржава».

У рабоце канферэнцыі возьмуць удзел не толькі вядучыя навукоўцы, але і высокія дзяржаўныя асобы краіны, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу і міжнародных арганізацый.

**Наш кар.**

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

19 снежня 2008 г. у 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ISSN 1990 - 763X

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже складской базы (имеется ж/д ветка), в составе: одноэтажное кирпичное административное здание, 105,1 кв.м; одноэтажное кирпичное административное здание, 66,1 кв.м; здание склада № 1, 1025,7 кв.м; здание склада № 2, 985,5 кв.м; здание склада № 3, 581,6 кв.м; гараж металлический (6х12); канализационная площадка; крановая эстакада однопролетная с бетонным покрытием; противопожарный водоем; склад цемента; асфальтированная площадка (2321 кв.м); забор ж/б (352 м.п.), расположенной по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Привокзальная, 2. Начальная цена с НДС – 1 672 813 663 белорусских рубля. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано три земельных участка – 0,1084 га; 0,5319 га; 0,5854 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.11.2008 г. Аукцион состоится **31 декабря 2008 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30 декабря 2008 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**БЕЛАРУСБАНК**

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 22 ДЕКАБРЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «АСБ Беларусбанк» пятнадцатой эмиссии.
2. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «АСБ Беларусбанк».
3. О внесении изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 декабря), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 22 декабря) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – до 20 декабря 2008 года.

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

УНП 100325912.

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.12.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 200,00 |
| 1 еўра | 3 007,40 |
| 1 латвійскі лат | 4 242,60 |
| 1 літоўскі літ | 870,84 |
| 1 чэшская крона | 114,14 |
| 1 польскі злоты | 742,74 |
| 1 расійскі рубель | 79,71 |
| 1 украінская грыўня | 271,60 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 27,6009 |
| 10 UAH | 37,8188 |
| 1000 BYR | 12,5402 |
| EUR | 35,16042 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 16.12.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2250 / 2300 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У АЎТОБУСЕ, ЯКІ РАЗБІЎСЯ Ў ІЗРАІЛІ, ЕХАЛІ ТУРЫСТЫ З РАСІІ



**У аўтобусе, які зваліўся ў прорву на поўдні Ізраіля 16 снежня, знаходзілася турыстычная група з Расіі, а менавіта — з Санкт-Пецярбурга, паведамляе Haaretz.**

Расіяне ехалі з аэрапорта Увда ў Эйлат. Паводле інфармацыі выдання, у выніку аварыі загінулі 24 чалавекі. Раненні рознай ступені цяжкасці атрымалі каля 30 турыстаў.

Аварыя адбылася на поўначы ад горада-курорта Эйлат. У аўтобусе знаходзіліся 54 чалавекі.

Пасля здарэння на працягу некалькіх гадзін на месцы аварыі працавалі брыгады медыкаў і выратавальнікаў, былі задзейнічаны тры верталёты. Што стала прычынай аварыі пакуль не выяўлена.

### СПАД У ПРАМЫСЛОВАСЦІ РАСІІ: ГЭТА КАТАСТРОФА

**Звесткі аб стане расійскай прамысловасці, якія апублікавала Федэральная служба дзяржстатыстыкі РФ, можна ахарактарызаваць адным словам — «катастрофа». Так гэтую сітуацыю ацаніў былы саветнік прэзідэнта па эканамічных пытаннях Андрэй Іларыёнаў.**

Іларыёнаў, вывучыўшы інфармацыю Расстата, апублікаваў зводныя табліцы ў сваім блогу. Ён адзначыў пры гэтым, што такіх тэмпаў зніжэння прамысловай вытворчасці, як у лістападзе, не фіксавалася, прынамсі, апошнія 19 гадоў. У самыя цяжкія месяцы прамысловых спадаў у 1992, 1994 і 1998 гадах, такіх тэмпаў зніжэння не адзначалася.



Відавочна, мяркуе Іларыёнаў, апошні раз, калі складалася падобная сітуацыя — гэта перыяд Другой сусветнай вайны, хутчэй за ўсё, 1941—1942 гады.

Нагадаем, у аўторак Расстат апублікаваў звесткі пра маштабы скарачэння прамысловай вытворчасці ў Расіі ў лістападзе 2008 года — яна знізілася на 10,8 працэнта ў параўнанні з кастрычнікам.

### ВЯРХОЎНАЙ РАДЗЕ УКРАІНЫ ЗНОЎ ПАГРАЖАЕ РОСПУСК

**Апазіцыйная Партыя рэгіёнаў у парламенце Украіны, якая налічвае больш за 170 дэпутатаў, можа скласці 150 мандатаў, каб прэзідэнт Віктар Юшчанка падпісаў указ аб роспуску Вярхоўнай Рады.**

Аб гэтым заявіў 16 снежня дэпутат ад Партыі рэгіёнаў Яраслаў Сухый. Ён адзначыў, што «калі кааліцыя і далей будзе ігнараваць патрабаванні апазіцыі, то нічога не застанецца як... скласці дэпутацкія мандаты». «Проста так мы не будзем сядзець у Радзе, ствараючы ім масоўку. Гэта рэальная пагроза роспуску парламента», — падкрэсліў Сухый.

Адзначым, што калі дэпутаты Партыі рэгіёнаў ажыццявяць свой намер, Вярхоўная Рада будзе прызнаная недзеяздольнай.

### У ПАРЫЖСКАЙ КРАМЕ АБЯСШКОДЗІЛІ ПЯЦЬ БОМБАЎ

**Паліцыя эвакуявала персанал і наведвальнікаў парыжскага ўнівермага Printemps Haussmann пасля паведамлення аб закладзеных у будынку выбуховых прыладах.**

Пасля на тэрыторыі крамы эксперты-выбухатэхнікі знайшлі і абясшкодзілі пяць бомбаў, паведамляе AFP. Дэтанатара ў краме знайсці не атрымалася. Незадоўга да інцыдэнту агенцтва France Presse атрымала ліст ад імя нейкага Рэвалюцыйнага фронту Афганістана, у якім паведамлялася аб закладзеных бомбах. Паводле ўдакладненых звестак, раней невядомая групоўка запатрабавала вывесці французскія войскі з Афганістана. Чаму актывісты Рэвалюцыйнага фронту Афганістана папярэдзілі аб мініраванні крамы да выбуху, не ўдакладняецца.

## СВЯТОЧНЫ ГРАФІК ПАЛІКЛІНІК

**Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, у сувязі з пераносам у Беларусі рабочых дзён у снежні 2008 года і студзені 2009 года графік работы амбулаторна-паліклінічных арганізацый таксама змяніўся.**

Так, 20 снежня 2008 года і 10 студзеня 2009 года амбулаторна-паліклінічныя ўстановы будуць працаваць па графіку рабочых дзён, 25 снежня і 1 студзеня — па графіку працы ў святочныя дні.

26 і 27 снежня 2008 года, а таксама 2 і 3 студзеня 2009 года — па суботнім графіку. А 28 снежня і 4 студзеня — па графіку працы ў выхадныя дні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**белагропромбанк** традиции будущего

***С 17 декабря 2008 г. на основании Постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 10.12.2008 № 190***

**РАЗМЕР СТАВКИ РЕФИНАНСИРОВАНИЯ УСТАНОВЛЕН В РАЗМЕРЕ 12 ПРОЦЕНТОВ ГОДОВЫХ**

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенных в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенных в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 1,0 процентный пункт с 17.12.2008.

**КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136**

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

**ОАО «АВТОБАЗА» г. Заславль (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания склада сыпучих материалов, об. пл. 394,1 кв.м, и прилегающей площадки для обслуживания склада (бетонная площадка — об. пл. 198,23 кв.м; откос (партерный газон) — 1134,873 кв.м; подъездные пути (асфальт) — 422,98 кв.м; площадка перед пандусом 1 (бетон) — 236,567 кв.м; площадка перед пандусом 2 (песчано-гравийная смесь) — 224 кв.м; бордюрный камень — 51 м, ограждение (ж/б панели — 48 м), расположенного по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 122. Начальная цена с НДС — 253 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,2856 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**БЕЛИНВЕСТБАНК**

**ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» СООБЩАЕТ,**

**что 23 декабря 2008 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.**

**В повестку дня собрания внесены следующие вопросы:**

***1. О процедурных вопросах.***
***2. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белинвестбанк».***
***3. Об утверждении Решения о шестом выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «Белинвестбанк».***
***4. О внесении изменений в Устав ОАО «Белинвестбанк».***
***5. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***
***6. Об утверждении изменений и дополнений в Положение о Наблюдательном совете Открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».***
***7. Об утверждении изменений и дополнений в Положение об управлении внутреннего аудита, контроля и ревизий ОАО «Белинвестбанк».***

Бюллетени для заочного голосования, иную информацию о проведении внеочередного общего собрания акционеры банка (их представители), имеющие право на участие в собрании, могут получить при их обращении в банк по адресу: 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29 или в его филиалы по месту учета акций при предъявлении документа, удостоверяющего личность акционера (его представителя).

**Телефоны для справок: (8 017) 239 01 41, 239 01 42.**

*Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.*

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

17 снежня 2008 г.
№ 48 (151)


ШТО Ў КАШАЛЬКУ?

## БУДУЧЫНЯ МАЛЕНЬКАГА ГОРАДА

**Сярод крыніц папаўнення бюджэту пярвічнага ўзроўню, прапісаных ва Указе № 21, няма ні падаходнага падатку, ні падатку з продажу, ні збору за ўтрыманне сабак, ні курортнага збору. Асобнымі даходнымі артыкуламі на сваёй тэрыторыі іх зацвердзіў Віцебскі абласны Савет дэпутатаў.**

Гэта практыка атрымала назву «віцебскі варыянт» і стала тэмай гарачых спрэчак і дыскусій. За два гады «віцебскі варыянт» даказаў сваю эфектыўнасць: аб'ём датацый бюджэтаў пярвічнага ўзроўню вобласці скараціўся ў некалькі разоў.

У сёлетнім бюджэце Дзісны, які з'яўляецца горадам раённага падпарадкавання (а, значыць, таксама падпадае пад дзеянне Указа № 21), падаходны падатак і падатак з продажу складаюць ільвіную долю даходаў — 57 працэнтаў. Доля сродкаў, якія пералічваюцца з Фонду фінансавай падтрымкі, не перавышае 25 працэнтаў.

— На 2008 год Міёрскі раённы Савет выдаткаваў нам 19,6 працэнта падаходнага падатку, які выплачваюць работнікі дзвюх нашых мясцовых арганізацый — школы-інтэрната і лясгаса, — тлумачыць старшыня Дзісненскага гарадскога Савета дэпутатаў Вольга Мароз. — У грашовым вымярэнні гэта 50 мільёнаў рублёў. Падатак з продажу, дакладней, яго частка (58,3 працэнта) прыносіць у гарадскі бюджэт 25 мільёнаў рублёў. Без гэтых дзвюх даходных крыніц наш узровень датацыйнасці склаў бы працэнтаў 50, а то і болей.

**Тое, што чалавек атрымаў задарма, ён не цэніць і не шкадуе.**

Акрамя падаходнага падатку і падатку з продажу крыніцамі папаўнення гарадскога бюджэту з'яўляецца падатак на зямлю з фізічных асобаў і падатак на нерухомасць. Праўда, іх плацяць толькі працаздольныя грамадзяне, таму сума набягае нязначная — 4,3 і 9,4 мільёна адпаведна.

— Прыватны сектар у нас даволі вялікі, — тлумачыць Вольга Аляксандраўна, — аднак асноўная доля яго жыхароў — пенсіянеры, большасць з якіх — адзінока пражываючыя, а гэтая катэгорыя вызвалена ад памянёных падаткаў. Такім чынам, у адрозненне ад сельскай мясцовасці, нас падаткі на зямлю і на нерухомасць не пракармілі б.

Аўкцыёны па продажы зямельных участкаў для Дзісны пакуль неактуальныя. Паводле слоў старшыні, гарвыканкам даўно падрыхтаваў два ўчасткі (кадастравая ацэнка 15 сотак не перавышае 2 мільёнаў рублёў), аднак заявак на ўдзел у аўкцыёне пакуль ніхто не даваў. Гэта і зразумела: у горадзе ёсць пустыя сядзібы, якія можна набыць разам з зямлёй без усякага аўкцыёну.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

## ЗАЦІКАВІЦЬ ПРАДПРЫМАЛЬНІКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Відаць, гэта адно з самых галоўных пытанняў, з якім сутыкаюцца мясцовыя ўлады, закліканыя рэалізоўваць Дзяржаўную комплексную праграму развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў. У яе ўключаны 31 населены пункт Гомельскай вобласці. Гэта практычна ўсе гарадскія пасяленні, за выключэннем Гомеля, Мазыра, Светлагорска, Рэчыцы і Жлобіна. У малых гарадах вобласці пражывае 250 тысяч чалавек, або амаль чвэрць гарадскога насельніцтва.**

Калі зазірнуць у статыстычныя звесткі, то высвятляецца, што рэалізацыя праграмы (для ўвасаблення якой «у запасе» ёсць яшчэ два гады), на Гомельшчыне прасоўваецца не вельмі хутка. Прагнозныя параметры развіцця па вытворчасці прамысловай прадукцыі за 9 месяцаў не выкананыя ў Буда-Кашалёўскім, Добрушскім, Жыткавіцкім, Калінкавіцкім, Рэчыцкім, Рагачоўскім, Гомельскім раёнах. Калі ўзяць вытворчасць спажывецкіх тавараў, то да гэтых раёнаў трэба дадаць Лоеўскі і Светлагорскі. Па колькасці малых прадпрыемстваў — яшчэ і Жлобінскі.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі заклікае сваіх калег з мясцовых Саветаў не сядзець склаўшы рукі і прапаноўвае шэраг захадаў, якія маглі б актывізаваць стварэнне новых прадпрыемстваў, а значыць, новых рабочых месцаў у невялічкіх населеных пунктах. Трэба трымаць нос па ветры — даведвацца, дзе разгорнута вытворчасць, прадукцыя якой арыентавана менавіта на насельніцтва раёна. І распаўсюджваць станоўчы вопыт на іншыя гарадкі. Менавіта таму ў сельскіх і пасялковых Саветах павінны быць пад рукою дакументы аб ільготах, фотаздымкі і ўсё тое, што можна прапанаваць патэнцыйнаму прадпрымальніку.

Старшыня Калінкавіцкага раённага Савета дэпутатаў Валерый Ціханоўскі кадрамі займаецца асабіста. Каб паступова перавесці збор малака ў прадпрымальніцкі сектар, ён звазіў у Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці (дзе падобная ініцыятыва ўвасоблена ў жыццё) мясцовага фермера Юрыя Секача. І вось ужо тры месяцы, як той адзін працуе замест ранейшых васьмі малаказборшчыкаў. І сам на заробак не скардзіцца, і людзі ведаюць, што праблем з іх малаком не будзе. Задаволеныя і мясцовыя прадпрыемствы, якія ўжо да 9.30 раніцы атрымліваюць якасны прадукт.

Старшыня Жлобінскага райсавета Міхаіл Касюкоў сёння пераконвае аднаго жлобінскага прадпрымальніка стварыць філіял аўташколы ў Стрэшыне. Ёсць і ахвотнікі купіць былую кавярню райспажыўсаюза... Увогуле ж прадпрымальнікі асцярожнічаюць, у асноўным выказваюць жаданне толькі гандляваць.

— У нас два праблемныя пытанні на Беларусі, — лічыць кіраўнік прадстаўнічай улады Гомельскай вобласці Валерый Сяліцкі. — Гэта падзенне попыту на нашу прадукцыю — таму што сёння замежныя, у прыватнасці, расійскія спажыўцы, з'яўляюцца неплацежаздольнымі, і крызіс крэдытных рэсурсаў. Няма дзе браць валюту на закупку замежных камплектуючых і г.д. Менавіта таму дзяржава пастаянна стымулюе ўнутраны попыт — каб нам утрымацца ва ўмовах сусветнага крызісу і абысціся без валюты. У гэтай сітуацыі ў выйгрышы будуць малыя прадпрыемствы, якія працуюць з нашым насельніцтвам.

У населеных пунктах, якія сёння адносяць да катэгорыі малых гарадоў, ёсць шмат памяшканняў, якія не выкарыстоўваюцца. Менавіта сельскія Саветы распараджаюцца гэтай маёмасцю. І сёння неабходна як мага хутчэй разабрацца, якім чынам згаданыя будынкі змогуць прынесці карысць. Калі спатрэбіцца, прадаць іх за сімвалічную плату. Так, за 151 тысячу беларускіх рублёў у мінулым месяцы набылі прадпрымальнікі-пачаткоўцы з Рагачова былую ферму буйной рагатай жывёлы ў вёсцы Шапчыцы Званецкага сельсавета. Зараз плануюць наладзіць тут перапрацоўку драўніны.

Валерый Сяліцкі лічыць, што менавіта ў невялічкіх населеных пунктах могуць быць размешчаны і філіялы буйных прадпрыемстваў. Але ж павінна быць непасрэдная зацікаўленасць у гэтым буйных вытворцаў. Многія кіраўнікі ўпэўнены, што нашы калгаснікі працаваць не ўмеюць. У такім выпадку іх трэба вучыць. І цэнтр занятасці, адзначае старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў Алена Алексіна, здольны аказаць дапамогу ў гэтай справе. Але пакуль ідзе адваротны працэс: швейнае прадпрыемства «Гамяльчанка» прыпыніла вытворчасць у гарадскім пасёлку Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна, у Церахоўцы Добрушскага раёна некалькі гадоў таму закрылі маслазавод.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

АДКРЫТЫ ФОРУМ

## ПРЫХОД І РАСХОД

**У канцы года прынята падводзіць вынікі. І будаваць планы. І ў межах асобна ўзятай кватэры, і ў межах кожнай тэрытарыяльнай адзінкі. З той розніцай, што сусед па лесвічнай пляцоўцы наўрад ці дасць вам поўную «раскладку» крыніц сваіх даходаў. А вось даходныя крыніцы сельсавета дакладна вызначаны ўказам № 21.**

Не трэба быць эканамістам, каб разумець: даходная частка любога бюджэту не павінна адставаць ад расходнай. Аднак сродкаў, якія самастойна зарабляюць сельвыканкамы, хапае на тое, каб пакрыць толькі пэўную частку неабходных затрат. Няхватка грошай кампенсуецца за кошт датацый з вышэйшых бюджэтаў. Натуральна, дзяржава зацікаўлена ў тым, каб «пярвічны ўзровень» больш актыўна выкарыстоўваў абазначаныя даходныя крыніцы і на месцах шукаў рэзервы для папаўнення свайго бюджэту. У якой ступені ўдаецца сёння гэта зрабіць? На пытанне «МС» адказваюць кіраўнікі пярвічнага звяна ўлады.

**Антаніна ЛАГАЧ, старшыня Зеляневіцкага сельскага Савета дэпутатаў Пружанскага раёна:**

— Яшчэ летась датацыі з раённага бюджэту даходзілі ў нас да 80 працэнтаў. Але сёлета сітуацыя змянілася — сельсаветам пачалі часткова пералічваць падатак з продажу, і ў выніку аб'ём датацый зменшыўся да 27 працэнтаў. Мы ад гэтага, безумоўна, выйграем — з'явілася больш стабільная крыніца папаўнення бюджэту.

Падаткі на зямлю і на нерухомасць — нашы, так бы мовіць, «кроўныя» грошы — засталіся сёлета на ранейшым узроўні. Ёсць яшчэ і такая прыкметная крыніца даходаў, як падатак на нерухомасць па незавершаных будаўніцтвам аб'ектах. Сельсавету вельмі выгадна, калі на яго тэрыторыі знаходзіцца сельскагаспадарчае прадпрыемства, якое развіваецца, будуецца і таму плаціць падаткі па незавершаным будаўніцтве — нам паступаюць пэўныя адлічэнні.

Затое зменшыліся паступленні ад нарыхтоўшчыкаў дзікарослай прадукцыі. Летась мы атрымалі 2,5 мільёна рублёў, сёлета — 1 мільён 450 тысяч. Безумоўна, сельскі Савет павінен быць зацікаўлены ў тым, каму і куды людзі здаюць грыбы, ягады, лекавыя травы і да т.п., сачыць, каб нарыхтоўшчыкі былі зарэгістраваныя ў нас у раёне. Калі нарыхтоўшчык не зарэгістраваны — ён пакладзе ўсе грошы ў сваю кішэню. Але мы мяжуем з Ваўкавыскім раёнам Гродзенскай вобласці, і калі адлегласць да Пружанаў — 60 кіламетраў, то да Ваўкавыска — 35. Вось там і «асядаюць» нашы грошы — менавіта туды людзі вязуць сабраныя дары лесу. Там і работа нарыхтоўшчыкаў арганізавана добра, і расцэнкі вышэйшыя.

Аўкцыёны па продажы зямельных участкаў не праводзім. У нас свабоднай зямлі, як кажуць, бяры не хачу — участкі пад будаўніцтва не карыстаюцца попытам. Увогуле на нашай тэрыторыі няма ніводнага індывідуальнага забудоўшчыка — ужо не першы год... Ды і навошта гэта людзям, калі гаспадарка актыўна будуе жыллё, і ўсе, каму трэба, яго атрымліваюць. Нават тыя, хто, на мой погляд, мог бы крыху пачакаць. Так што на заробкі ад продажу зямлі з аўкцыёну мы ў бліжэйшы час не разлічваем.

**Тамара ЛЯЙКО, старшыня Красненскага сельскага Савета дэпутатаў Карэліцкага раёна:**

— Асноўную даходную частку ў нас складалі і складаюць зямельны падатак (каля 18 мільёнаў рублёў), падатак на нерухомасць (каля 7 мільёнаў рублёў) і дзяржпошліна (1,4 мільёна). Адзінае, што дадалося, — гэта адлічэнні ад падаткаў з продажу (15 мільёнаў). А вось астатнія крыніцы даходаў не спрацоўваюць. У іншых абласцях ёсць попыт на зямлю, і сельсаветы маюць магчымасць зарабіць грошы дзякуючы аўкцыёнам. У нас такі попыт адсутнічае, хоць і аб'явы даём. Ведаеце, колькі тут каштуе ўчастак пад гандлёвы кіёск? Стартавая цана ў адпаведнасці з кадастравай ацэнкай — 17 тысяч рублёў (!), смешная лічба, людзі мне не вераць, перапытваюць. І нават пры такім раскладзе практычна няма ахвотных удзельнічаць у таргах. Чакаем...

Ці ўзяць той жа зямельны падатак. У адпаведнасці з законам мы замацоўваем за домаўладаннем 25 сотак — скажам, калі чалавек уступае ў права на спадчыну. Зямлю звыш гэтых 25 сотак можна браць у арэнду, але каштуе яна капейкі, людзі плацяць па 3 тысячы рублёў за год. Самае большае — 8 тысяч рублёў, калі ўчастак вялікі. Раней сельскі Савет меў права павялічваць арэндную плату, цяпер не мае. І нам гэта зусім не выгадна.

**Віктар ПАЛТАРАН, старшыня Княжыцкага сельскага Савета дэпутатаў Магілёўскага раёна:**

— Натуральна, мы — датацыйны сельсавет, таму, як і многія іншыя, шукаем сродкі для папаўнення бюджэту. На сёння рэальна працуе такая крыніца даходаў, як продаж зямельных участкаў з аўкцыёну. Мы пакуль прадалі толькі адзін участак — яшчэ, шчыра кажучы, не раскачаліся. А прадаваць ёсць што, і пакупнікоў хапае. У нашым раёне некаторыя сельсаветы маюць дзякуючы гэтай крыніцы добрыя даходы (кошт участкаў даходзіць да 20 тысяч долараў).

Грошы, атрыманыя за прададзеную зямлю, мы маем права патраціць на добраўпарадкаванне тэрыторыі (у першую чаргу таго населенага пункта, дзе знаходзіцца ўчастак), а таксама на падрыхтоўку да аўкцыёну іншых участкаў (адвод зямлі, афармленне неабходных дакументаў, размяшчэнне аб'яў і г.д.). Зыходзячы з гэтага, будзем выбіраць і выстаўляць на аўкцыёны ўчасткі ў тых населеных пунктах, якія маюць больш вострую патрэбу ў добраўпарадкаванні.

Зразумела, што такая крыніца даходаў не бясконцая. Трэба шукаць яшчэ нешта. Пакуль думаем. Раней я схіляўся да таго, каб стварыць у сельвыканкаме гасразліковую камунальную структуру — займацца вывазам смецця і апрацоўкай зямельных участкаў вяскоўцаў. Але... Вывазам смецця пачало займацца прадпрыемства ЖКГ, тут ужо праблем няма. Пытанні з апрацоўкай зямельных участкаў таксама вырашаюцца. Па-першае, людзі сталі менш сеяць і саджаць, а больш купляць у магазінах. А па-другое, іх участкі ўключаюцца ў агульныя палі севазвароту гаспадаркі, якая сама ўсё апрацоўвае, а з чалавекам разлічваецца гатовай прадукцыяй. Інакш кажучы, неабходнасць у паслугах гасразліковай структуры пачынае адпадаць. Значыць, трэба выйсці на нейкі іншы ўзровень паслуг. Думаем, шукаем... Галоўнае, ёсць жаданне папрацаваць у гэтым накірунку.

**Галіна МАЛАХОЎСКАЯ, старшыня Відзаўскага сельскага Савета дэпутатаў Браслаўскага раёна:**

— Калі летась узровень датацыі складаў у нас 89 працэнтаў, то сёлета ён знізіўся да 29 працэнтаў. Спрацавала адразу некалькі крыніц. Напрыклад, мы перавыканалі запланаваныя паказчыкі па падатках на зямлю і на нерухомасць — атрымалі 35 мільёнаў рублёў замест 26 мільёнаў. Справа ў тым, што ўсе будынкі, прыдатныя для пражывання, у нас хутка раскупляюцца. Я нават сказала б, што попыт перавышае прапанову — дзякуючы перш за ўсё непаўторным краявідам нашай мясцовасці.

Акрамя таго, сёлета ў сельсавецкі бюджэт пачалі паступаць адлічэнні ад падатку з продажу. Калі ўвесь бюджэт нашага сельсавета на год складае 204 мільёны 527 тысяч рублёў, то доля падатку з продажу ў ім — 100 мільёнаў 135 тысяч. (Дарэчы, з іх мы зрасходавалі толькі 92 мільёны, а зэканомленыя грошы размесцім у банку.)

Добра спрацавала і такая крыніца, як збор з нарыхтоўшчыкаў — атрымалі 5,8 мільёна рублёў замест запланаваных 3,3 мільёна. Усё, што датычыцца нарыхтоўкі сельгаспрадукцыі і дзікарослых пладоў, арганізавана ў нас, лічу, на нармальным узроўні. Непасрэдна на нашай тэрыторыі закупам займаюцца 17 крамаў спажыўкааперацыі, 2 аўтакрамы, прыёмны пункт у Відзах і тры лясніцтвы Нацыянальнага парку. Так званы «стыхійны закуп» прадукцыі — сельскагаспадарчай і лясной — у нас практычна выключаны. Дазвол на нарыхтоўчую дзейнасць даюць адпаведныя раённыя службы, якія, у сваю чаргу, абавязкова ўдакладняюць у сельвыканкама, ці патрэбны яму дадатковыя паслугі такога кшталту?

У якасці крыніцы папаўнення бюджэту нам прапануюцца і новыя віды штрафаў — напрыклад, спагнанні за самавольную высечку, за эксплуатацыю меліярацыйных сістэм. Але гэтыя нававядзенні неабходна яшчэ адпрацаваць — аднаму старшыні сельскага Савета справіцца з іх укараненнем будзе цяжка, спатрэбіцца дапамога адпаведных службаў.

Нельга забываць і пра такую крыніцу даходаў, як суботнікі. Дзякуючы апошняму сельсавецкі бюджэт папоўніўся на 5 мільёнаў рублёў — грошы пералічваюць усе арганізацыі, якія знаходзяцца на нашай тэрыторыі. Яны будуць выкарыстаны з улікам пажаданняў насельніцтва.

**Наталля КАРПЕНКА.**

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

## ЧЕМ ЗАКОНЧИЛАСЬ ИСТОРИЯ С ПАЦИЕНТОМ

**В «Местном самоуправлении» (за 19.11.08 г.) был опубликован материал «Гісторыя з пацыентам» — о визите жителя г. Витебска в городскую поликлинику. Редакция получила реагирование.**

«Администрация Государственного учреждения здравоохранения «Витебская городская центральная поликлиника» в ответ на критическую статью «История с пациентом», изложенную в вашей газете (№ 44 от 19.11.08) сообщает, что во всех структурных подразделениях учреждений здравоохранения г. Витебска и Витебского района проведены производственные совещания по вопросам улучшения качества и доступности медицинского обслуживания населения.

Статья обсуждена в каждом трудовом коллективе, повторно отработан алгоритм действия медработников в нестандартных ситуациях в целях недопущения причин, порождающих негативные обращения граждан.

Согласно информации, представленной УЗ «Витебская городская поликлиника № 6»:

по фактам, изложенным в статье, проведена служебная проверка;

виновные лица привлечены к дисциплинарной ответственности;

приняты меры по предупреждению подобных недостатков в дальнейшем.

Благодарим вас за критические замечания, высказанные в статье.

**С уважением, главный врач ГУЗ «ВГЦП» С.А. БЕЛЯЕВ».**

## ЯГАДНЫ КРАЙ

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

### Як мог бы зарабляць буйны сельсавет

**Дварэц на Лунінеччыне — як Альшаны на Століншчыне. Толькі апошнія славяцца сваімі агуркамі, а ў вёсках Лунінецкага раёна вырошчваюць салодкую ягаду. У Дварцы ды і суседніх вёсках клубніцы садзяць, колькі жывуць. Недзе ў хрушчоўскую адлігу, як толькі ўлады перасталі забараняць падсобную гаспадарку (калі маладняк жывёлы хавалі ад упаўнаважаных пад прыпечкам, у каморах, на паддашку), узяліся палешукі апрацоўваць кожны лапік зямлі.**

Садзілі клубніцы — бо ў адрозненне ад непастаяннай аплаты ў калгасе, гэта заўсёды былі жывыя грошы. За дзесяцігоддзі вырошчванне ягады стала для вяскоўцаў асноўным відам даходаў, галоўным фундаментам любой сям'і — яе, так бы мовіць, філасофіяй і ідэалогіяй. Бо адразу, калі толькі маладыя пажэняцца, на першыя прыбыткі сям'і купляюць машыну, потым пачынаюць будаваць дом. Гэта правіла, адступленне ад якога, па вясковых мерках, сведчыць аб несаліднасці, несур'ёзнасці гаспадароў. Жывуць вяскоўцы ў асноўным заможна. Дамы абкладзены цэглай, амаль на кожным падворку — трактар. У хаце, як правіла, ёсць усе зручнасці. Мэбля і бытавая тэхніка нічым не адрозніваюцца ад абстаноўкі гарадскіх кватэр.

...У адзінаццаць раніцы спецыялізаваны павільён каўбаснага цэха мясцовага сельгаспрадпрыемства быў зачынены. «Значыць, ужо разабралі, — патлумачыў старшыня сельскага Савета Фёдар Велясюк. — Кожны дзень з цэха падвозяць свежую прадукцыю, вяскоўцы падыходзяць да адкрыцця і разбіраюць». Варта адзначыць, што сельскія магазіны не бедныя на асартымент, але мясную прадукцыю вяскоўцы любяць набываць самую свежую, адразу з канвеера. Хто мае грошы, той можа выбіраць.

### Адкуль грошы?

Асноўныя грошы тут — з ягады. Клубніцамі займаюцца ўсе: хатнія гаспадыні, работнікі школ, амбулаторый і ФАПаў, устаноў культуры, сельгаспрадпрыемстваў. Не займаюцца з маладзейшых адзінкі. У асноўным тыя, чый дзень і пачынаецца, і заканчваецца каля вясковай крамы. Такія у грамадскай свядомасці лічацца лайдакамі і недарэкамі, словам, апошнімі людзьмі.

Цяпер у вёсках зацішша. Памытыя снежаньскімі дажджамі плантацыі клубніц адметныя ў полі, яны выдзяляюцца асаблівымі чырванаватымі лістамі. Каля дарогі пасецца прывязаны конік. У садзе старасты Дварца Аляксандра Яскевіча вісяць на дрэве каштэлі. Карціна хоць і не зімовая, але рытм жыцця зімовы. На плошчы каля будынка сельскага Савета прадаюць з машыны капусту і цыбулю. Танна, усё па 400 рублёў за кілаграм. Гэта выязны гандаль цяпліцы СВК «Дварэц», таму свае работнікі могуць браць агародніну ў лік зарплаты, ну а іншыя — за наяўны разлік. Вяскоўцы запасаюцца прадуктамі, бяруць у асноўным мяшкамі.



Староста вёскі Дварэц Аляксандр ЯСКЕВІЧ.

У полі ніхто не працуе, а вось у амбулаторыі чарга, нібы ў гарадскіх паліклініках. Тут часова адсутнічае ўрач, таму Марыя Гец, галоўны ўрач амбулаторыі у Язвінках, прымае ў Дварцы хворых двойчы на тыдзень. Вось і спяшаюцца людзі ў прыёмныя дні атрымаць кансультацыю і прызначэнні. Зіма — самы час паклапаціцца пра здароўе. А ў амбулаторыі, якую капітальна адрамантавалі падчас узвядзення аграгарадка, ёсць усе ўмовы для нескладанага лячэння, можна прайсці курс кропельніц і фізіяпрацэдур. Усяго штат вясковай лячэбнай установы складае дзесяць чалавек. У фельчара Аксаны Бярозкі і ўчастковай дзіцячай медсястры Вольгі Хадатчук цікаўлюся, ці вырошчваюць яны клубніцы. У адказ чую: «А як жа! У нас усе вырошчваюць». Тэму падхопліваюць наведвальніцы, мамы пацыентаў: «Як жа мы жылі б, будаваліся, дзяцей вучылі?». Аказваецца, у многіх вяскоўцаў дзеці вучацца на платных аддзяленнях універсітэтаў у сталіцы, Брэсце, Гродне. Бацькам з Дварца, Вічына, іншых навакольных вёсак аплаціць навучанне нескладана. Але даюцца гэтыя грошы, вядома, цяжкай працай.

Сям'я садзіць ягады, колькі плошча дазваляе і колькі зможа апрацаваць. У адных плантацыя складае 20 сотак, у іншых — гектар. Тры-чатыры разы трэба з вясны прапалоць участак, расліну своечасова падкарміць. Ды і збор ураджаю ў сезон — цяжкая работа. У Кацярыны Калінковіч, школьнай тэхнічкі, дзеці ходзяць у 5-ы і 9-ы класы. Хлопцы — першыя памочнікі маці. У мінулыя гады яны адпачывалі летам звычайна ў санаторыі, а сёлета засталіся дома, каб дапамагаць маці збіраць ягады. Муж Кацярыны працуе ў Маскве. Гэта, дарэчы, яшчэ адна адметнасць Дварца. Многія мужчыны знайшлі работу ў расійскай сталіцы.



Валянціна ШЫМКО, прадавец мясцовай цяпліцы.

### Сельсавет і сезон нарыхтоўкі

Дварэцкі сельсавет вялікі — сем тысяч насельніцтва, адлегласць з аднако канца ў другі сорак кіламетраў. Апошнім часам усё болей сем'яў заводзяць па трое-чацвёра дзяцей. Словам, людзі тут працавітыя, свой дабрабыт здабываюць самі, спрадвеку нічога ні ў каго не прасілі. А вось мясцовая ўлада адчувае сябе перад імі ў даўгу, бо не можа як трэба арганізаваць і ўпарадкаваць працэс здачы ўраджаю з падсобных гаспадарак.

— Каб вы зірнулі, што тут робіцца летам, — гаворыць старшыня сельскага Савета Фёдар Велясюк. — Гэта нешта сярэдняе паміж вялікім рынкам і масавым мерапрыемствам працягласцю ледзь не ў месяц. Нашэсце людзей і аўтатранспарту. У асобныя дні бывае 300 машын адразу. Скупшчыкі едуць па клубніцы з Масквы, С.-Пецярбурга, Мурманска, Мінска, Віцебска, Гомеля. Бачкавую ягаду забіраюць нарыхтоўшчыкі з вінзаводаў, спажыўсаюзаў, нарыхтоўчых кантор. І кожны са сваім транспартам. Бываюць выпадкі, што машыны перагароджваюць трасу, і рух па дарозе Гомель — Бранск спыняецца аж да таго моманту, пакуль работнікі ДАІ не прымуць адпаведныя меры. Там, дзе спыняецца такая колькасць людзей, пераварочваюцца тоны тавару без адпаведных на тое ўмоў, штодзень застаецца літаральна па калена смецця. Даводзіцца на гэты час наймаць два чалавекі і збіраць штодня тры кантэйнеры бытавых адходаў. Два ўчастковыя міліцыянеры дзяжураць увесь гэты час на месцы загрузкі практычна без адлучкі. Каб падтрымліваць парадак на гарачы летні сезон, сельвыканкаму даводзіцца прымаць часам вельмі нестандартныя меры.

Парадак павінен быць забяспечаны любой цаной, бо за яго ў рэшце рэшт спытаюць з мясцовай улады. А ў яе няма грошай, каб усё зрабіць толкам. Сама сабой напрошваецца ідэя браць грошы за паркоўку з вадзіцеляў фураў і іншых грузавікоў, якія затаварваюцца клубніцамі. Паводле слоў Фёдара Дзмітрыевіча, для перавозчыкаў, асабліва расійскіх, 10 тысяч рублёў, якія сельсавет прапаноўвае за паркоўку, — проста пыл, драбяза. І сельсавет узяўся збіраць з іх названую суму, але вельмі хутка мясцоваму органу ўлады ўказалі на незаконнасць такіх збораў.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ТВОЙ ПРАДСТАЎНІК У САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

***МАЗАЙ***
***Ніна Мікалаеўна***



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Нарадзілася 9 сакавіка 1950 года ў в. Чалюшчэвічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Мае дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь.

З 2001 па 2008 гг. — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Канадзе.

Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку».

***МОРАВА***
***Антаніна Пятроўна***



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**

Нарадзілася 27 ліпеня 1950 года ў сяле Грачанае Катоўскага раёна Валгаградскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі, аспірантуру Інстытута эканомікі Акадэміі навук БССР, Інстытут эканамічнага развіцця Сусветнага банка. Доктар эканамічных навук, прафесар.

З 2001 па 2006 гг. — міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Сустаршыня Беларускага саюза жанчын.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі».

***ПАЎЛАЎ***
***Міхаіл Якаўлевіч***



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Нарадзіўся 1 верасня 1952 года ў в. Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Акадэмію народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі. Кандыдат тэхнічных навук.

З 2000 года — старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны.

***ПАПОЎ***
***Вадзім Аляксандравіч***



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах.**

Нарадзіўся 5 ліпеня 1940 года ў г. Дзямідаве Смаленскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, Мінскую вышэйшую партыйную школу.

З 2007 па 2008 гг. — Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Садружнасць» (МПА СНД).

***РУБІНАЎ***
***Анатоль Мікалаевіч***



**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

Нарадзіўся 15 красавіка 1939 года ў г. Магілёве. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З 2002 па 2006 гг. — Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь; з 2006 па 2008 гг. — Першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

## ГОРАД МІНСК




***СМІРНОЎ***
***Яўген Аляксандравіч***



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.**

Нарадзіўся 15 сакавіка 1949 года ў г. Ражск Разанскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна.

З 2001 па 2008 гг. — першы намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

***ТАЛКАЧОЎ***
***Анатоль Васільевіч***



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**

Нарадзіўся 1 жніўня 1949 года ў г. Мінску. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (урач-лячэбнік).

З 1998 года — галоўны ўрач установы аховы здароўя «Мінскі кансультацыйна-дыягнастычны цэнтр».

Намеснік старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

***ШАКУЦІН***
***Аляксандр Васільевіч***



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Нарадзіўся 12 студзеня 1959 года ў в. Вялікае Бабіна Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут.

З 2005 года — намеснік генеральнага дырэктара па пытаннях перспектыўнага развіцця закрытага акцыянернага таварыства «Праммедінвест», старшыня Савета дырэктараў адкрытага акцыянернага таварыства «Амкадор».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

# БУДУЧЫНЯ МАЛЕНЬКАГА ГОРАДА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Праўда, кошт нерухомасці ў Дзісне ў апошнія некалькі гадоў узрос (па прычыне развіцця тут турыстычнага бізнэсу). Калі раней кінутую нежылую хату ў горадзе можна было набыць за 100 доляраў, то цяпер менш чым за 3,5-4 тысячы ніхто не прадасць. Відавочны плюс у параўнанні з аўкцыёнам яшчэ і ў тым, што калі чалавек набывае дом, ён адразу атрымлівае на рукі ўсе дакументы на сам будынак і на зямлю. Яму застаецца толькі заказаць рэканструкцыю, што значна танней, чым удзел у аўкцыёне, распрацоўка праекта і будаўніцтва новага дома.

Сур'ёзныя спадзяванні мясцовая адміністрацыя і гараджане ўскладаюць на развіццё аграэкатурызму. Ужо сёння пра Дзісну з яе багатай гісторыяй і маляўнічымі краявідамі ведаюць далёка за межамі краіны. Яна з'яўляецца адным з пунктаў прыпынку шэрагу турыстычных маршрутаў, у тым ліку вядомага шляху «з вараг у грэкі». Горад размяшчаецца на месцы зліцця дзвюх рэчак — Заходняй Дзвіны і Дзісны і мае багаты патэнцыял для далейшага развіцця, асабліва пасля ўступлення ў сілу ў кастрычніку гэтага года Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 185 «Аб некаторых пытаннях здзяйснення дзейнасці ў галіне аграэкатурызму». Ён унёс пэўныя дапаўненні ў папярэдні дакумент — Указ № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь», які прадастаўляў шэраг падатковых ільгот для гаспадароў сельскіх сядзібаў. Новы ўказ пашырыў кола дзейнасці льгот і на аграэкасядзібы, размешчаныя ў межах горада.

Агульны бюджэт Дзісны на 2008 год склаў 132 мільёны рублёў. Самы значны расходны артыкул — адлічэнні на ўтрыманне мясцовага ўчастка раённага ЖКГ (49 мільёнаў рублёў). Астатняе (83 мільёны) — гэта заробак старшыні гарвыканкама, спецыяліста першай катэгорыі, сакратара, качагара і прыбіральшчыцы, аплата камунальных плацяжоў Савета, транспартных расходаў, канцтавараў і падаткі.

— Трэба разумець, што бюджэт пярвічнага ўзроўню не ствараецца, а «спускаецца» зверху, — тлумачыць Вольга Мароз. — Горад, які мае добра развітую прамысловасць і прыбытковыя прадпрыемствы, як, скажам, Полацк ці Наваполацк, мае і значныя крыніцы даходаў. Узяць хаця б падаходны падатак ці падатак з продажу. Наш раён сельскагаспадарчы і на 50 працэнтаў датуецца з вобласці. Таму даць Дзісне такі бюджэт, які б цалкам задаволіў усе патрэбы, раён не ў стане. За вулічнае асвятленне (прыкладна 40 мільёнаў) горад увогуле не плаціць, гэтыя выдаткі пагашае раён. У такой сітуацыі цяжка гаварыць аб добраўпарадкаванні і аб развіцці інфраструктуры. Да выхаду Указа № 21 гарадскога бюджэту ўвогуле хапала толькі на ўтрыманне дзяржапарату гарсавета.

Цікава, што ў суседнім Шаркаўшчынскім раёне, які па ўзроўні прамысловасці і колькасці насельніцтва вельмі падобны на Міёрскі, у год на аднаго жыхара бюджэтам прадугледжана расходаваць 136 тысяч рублёў. У Міёрскім — толькі 8 тысяч рублёў. І такая сітуацыя захоўваецца не адзін год.

Паводле слоў Вольгі Аляксандраўны, у Дзісне практыкуюцца добраахвотныя ўзносы грамадзян на развіццё інфраструктуры, напрыклад, на ўстаноўку новай агароджы для могілак. Памер ахвяраванняў невялікі — 5 тысяч рублёў, аднак з улікам таго, што добраахвотнікамі падтрымаць інфраструктуру аказаліся далёка не ўсе гараджане, сёлета было сабрана толькі 2 мільёны рублёў.

Безумоўна, мы не збіраемся на гэтыя грошы ўстанаўліваць агароджы ў прыватным сектары, — тлумачыць старшыня, — кожны гаспадар павінен самастойна гэтым займацца. У 2003 годзе, калі ў гарадскі бюджэт залічваўся дзяржаўны збор на ўтрыманне і развіццё інфраструктуры, мы паставілі на адной з вуліц прыватнага сектара новыя агароджы. Сёння бачу, што гэта было зроблена дарэмна, бо тое, што чалавек атрымаў задарма, ён не цэніць і не беражэ.

Добра, што на 2009-2010 гады аблвыканкам зацвердзіў мерапрыемствы па паляпшэнні інфраструктуры горада Дзісны, а менавіта добраўпарадкаванне гарадскога цэнтра, парку, узбярэжнай зоны, а таксама аб'ектаў культуры, адукацыі, гандлю і аховы здароўя.

Сённяшнія гарады раённага падпарадкавання, як правіла, раней былі раённымі цэнтрамі. Страта статусу абумовіла закрыццё ў іх шэрагу мясцовых прадпрыемстваў, скарачэнне датацый на інфраструктуру, адток насельніцтва (у першую чаргу моладзі і працаздольных грамадзян). Цяпер такія гарады характарызуе пэўная закінутасць. Людзей сюды трэба прыцягваць працоўнымі месцамі, лічыць Вольга Мароз, і галоўны ўпор рабіць на развіццё прыватнага бізнэсу, у першую чаргу — вытворчасці.

— Пасля прыняцця Комплекснай дзяржаўнай праграмы па развіцці малых і сярэдніх гарадоў, якая прадугледжвае шэраг льгот для развіцця прадпрымальніцтва, у нас пачалі з'яўляцца прыватныя прадпрыемствы і новыя віды іх дзейнасці: вытворчасць мэблі, нарэзка туалетнай паперы, перапрацоўка драўніны. У Дзісне пакрысе пачынае раскручвацца прыватны бізнэс. Будучыня маленькіх гарадоў — за прадпрымальніцтвам.

**Інга МІНДАЛЁВА,**
*Міёрскі р-н.*

# ЯК ВЫКЛІКАЦЬ «ХУТКУЮ»?

**«Падкажыце, калі ласка, ці праўда, што ў Мінску выклікаць хуткую дапамогу можа цяпер і глуханямы чалавек?**

**С.Р,** *г. Мінск».*

Для прыёму зваротаў па экстраную медыцынскую дапамогу ад грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі слыху і маўлення, якія пражываюць або знаходзяцца на тэрыторыі Мінска, са жніўня гэтага года ў аператыўным аддзеле Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі адкрытая тэлефонная лінія прамога доступу ўваходных SMS-паведамленняў. Такія паведамленні прымаюцца кругласутачна ад абанентаў любых аператараў сотавай сувязі. Пры звароце ў службу хуткай дапамогі неабходна ў сціслай форме назваць асноўныя скаргі, прозвішча, узрост, пазначыць дакладны адрас, куды трэба выехаць брыгадзе хуткай дапамогі: вуліцу, нумар дома, корпус, пад'езд, нумар кватэры, паверх, код дзвярэй пад'езда. SMS-паведамленні трэба адпраўляць на нумар 8 029 443 67 12 або +375 29 443 67 12. У медыкаў адна просьба да пацыентаў: будзьце, калі ласка, уважлівыя пры наборы тэкстаў SMS-паведамленняў і карэктныя пры іх фармулёўцы.

# У АШМЯНАХ — НАВАСЕЛЛЕ

**30-кватэрны дом сацыяльнага прызначэння здадзены ў эксплуатацыю ў Ашмянах. Аб гэтым паведаміў старшыня Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта Юрый Адамчык.**

Навасельцамі сталі шматдзетныя сем'і, дзеці-сіроты, інваліды, а таксама жыхары старых будынкаў, жыллё якіх падлягала зносу. Восем кватэр атрымалі тыя, хто быў на ўліку ў выканкаме як ільготнік. Гэта першая такая навабудоўля ў Ашмянах за апошнія 10 гадоў. Кошт 5-павярховага дома склаў Br2 млрд 130 млн. Сродкі выдзелены з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў.

У Ашмянах спраектавалі і пачалі ўзвядзенне яшчэ аднаго 60-кватэрнага дома сацыяльнага прызначэння. Праект прадугледжвае будаўніцтва на першым паверсе дзвюх кватэр для інвалідаў-калясачнікаў, гэта значыць з шырокімі дзвярнымі праёмамі і пандусамі. У кватэрах такой катэгорыі людзей будзе ўстаноўлена і спецыяльная сантэхніка, адзначыў Юрый Адамчык.

**БЕЛТА.**

# ЯГАДНЫ КРАЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

А іншай крыніцы даходаў, каб упарадкаваць працэс у гарачую пару нарыхтоўкі, у сельсавета няма. На чым тут яшчэ можна зарабіць? Так гістарычна склалася, што мясцовы люд амаль не цікавіцца малым прадпрымальніцтвам, кароў трымае адносна няпмнога (на 7-тысячны сельсавет — 800 галоў буйной рагатай жывёлы). Тут вырошчваюць клубніцы на сваіх сотках. І вяскоўцам трэба спрыяць у іх гаспадарцы. А спрыяць — гэта значыць не перашкаджаць, не парушаць прывычны рытм жыцця, упарадкаваць летні вэрхал абапал дарогі.

— Трэба было б, — кажа старшыня сельскага Савета, — пабудаваць гасцініцу месцаў на дзесяць, абсталяваць стаянку, паставіць біятуалеты. Пакуль жа мы ўзвялі драўляную прыбіральню на краі лесу, але леснікі раз-пораз пагражаюць яе разбурыць — у іх гаспадарцы такі «аб'ект» непатрэбны.

Людзей для ўборкі смецця варта было б наняць на пастаяннай аснове. У іншы час года іх работа спатрэбіліся б для падтрымання ў парадку ўсіх кантэйнераў, якія стаяць у вёсках. Цяпер усе населеныя пункты сельсавета забяспечаны стацыянарнымі ёмістасцямі для збору бытавых адходаў. Здавалася б, зручна і гігіенічна. Але машыны ЖКГ забіраюць змесціва кантэйнераў раз на тыдзень. Бывае, што збіраюцца кучы і вакол скрыняў. «Дапамагаюць» у гэтым працэсе і гараджане, якія, здараецца, з машын на хаду кідаюць мяшкі са смеццем. Прыбіраць жа пастаянна няма каму. Няма такіх адзінак у штаце і няма грошай для ўтрымання. На сельсавет, які па памерах і адлегласцях можна параўнаць з Жабінкаўскім раёнам, патрэбна 650 лямпачак для вулічнага асвятлення — а яны маюць звычку перагараць. Ды і на добраўпарадкаванне такому сельсавету заўсёды патрэбны грошы. І яны, здавалася б, самі просяцца ў мясцовую казну, але браць іх нельга.

У Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» пункт аб мясцовых падатках і зборах адсутнічае. Летась падчас выязнога пасяджэння адной з камісій Савета Рэспублікі дварэцкаму старшыні абяцалі паставіць гэта пытанне на самым высокім узроўні. Але пакуль што адказу ён не атрымаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Лунінецкі раён.*

# ЗАЦІКАВІЦЬ ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Інвестыцыйныя праекты, якія рэалізуюцца ў малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях вобласці ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2007 года, таксама асвойваюцца не хутка. Да трох з іх рукі ўвогуле не дайшлі, а шэсць увасабляюцца зусім не тымі тэмпамі, якія былі запланаваны.

Начальнік аддзела навукова-інавацыйнай дзейнасці і інвестыцый Гомельскага аблвыканкама Андрэй Дземідавец кажа, што замежныя інвестары пакуль толькі прыглядаюцца да Беларусі. Насцярожвае іх не заканадаўчая база, якая дастаткова добра распрацавана, а недастатковы ўзровень развіцця інфраструктуры ў невялікіх населеных пунктах. Ёсць праблема і з кадрамі — лепшыя, як правіла, імкнуцца пераехаць у буйнейшыя населеныя пункты. Што тычыцца мясцовых інвестыцыйных праектаў, за кошт бюджэтных сродкаў робіцца многа, але працэс ідзе не так хутка, як хацелася б. Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу важна вызначыць прыярытэтныя напрамкі і менавіта туды эфектыўна ўкладаць сродкі.

**Замежных інвестараў насцярожвае не заканадаўчая база, а недастатковы ўзровень развіцця інфраструктуры.**

Алена Алексіна расказвае, што сёння ствараць рабочыя месцы для жыхароў у першую чаргу гарадскога пасёлка Уваравічы даводзіцца не толькі з дапамогай службы занятасці, але і праз інтэрнэт. Сёлета тут чатыры маладыя прадпрыемствы скарысталіся льготамі. Для стымулявання актыўнасці прыватных асобаў трэба перагледзець і спіс тых прадпрыемстваў і арганізацый, якім могуць даваць ільготы менавіта раённыя Саветы. «На бліжэйшай сесіі райсавета будзем прымаць рашэнне аб зніжэнні некаторых падаткаў», — адзначае Алена Алексіна.

Вырашыць праблему з жыллём у вёсцы таксама магчыма. Мясцовыя Саветы могуць прапанаваць усім зацікаўленым не толькі ўчастак пад будаўніцтва. Многія з нежылых дамоў можна перавезці і перабраць — чаму не выкарыстаць гэты рэсурс?

Не менш сур'ёзнае пытанне для вёскі — сацыяльная сфера. Пастаянны дыялог з насельніцтвам, а не толькі афармленне папер — вось адзіны магчымы стыль працы кіраўнікоў Саветаў у малых гарадках. Праўда, менавіта складанне бясконцых планаў і вялізная справаздачнасць, гаворыць старшыня Валасовіцкага сельскага Савета Акцябрскага раёна Павел Цішкунец, часта не пакідаюць часу на звычайныя стасункі з людзьмі. Акрамя таго, у названага сельскага Савета няма транспарту, таму 11 вёсак, якія ўваходзяць у склад тэрыторыі, праблематычна аб'ехаць нават за тыдзень.

Не сакрэт, што дастаткова многа ў малых гарадах беспрацоўных, алкаголікаў і «па сумяшчальніцтве» бацькоў, што пераклалі груз адказнасці за сваіх дзяцей на чужыя плечы. Сёння дзяржава займаецца тым, што ў адпаведнасці з Дэкрэтам № 18 шукае работу людзям, якія працаваць не хочуць. На Гомельшчыне доўг бацькоў за выхаванне іх дзяцей складаў на пачатак года 17 мільярдаў рублёў. Зараз ён зменшыўся: каля 7 мільярдаў усё ж атрымалася спагнаць. Менавіта дэпутаты сельскіх Саветаў могуць своечасова адрэагаваць на з'яўленне першых прыкмет дэградацыі канкрэтнага чалавека, лічыць Валерый Сяліцкі. Ад іх жа залежыць, па якім раскладзе на вёсцы працуюць крамы і «пітныя» ўстановы. Толькі агульнымі намаганнямі можна вярнуць да нармальнага жыцця калі не ўсіх, дык асобных грамадзян.

Увогуле, працуючы над рэалізацыяй Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў, трэба спадзявацца не на цуд, а на асабістую ўпартасць і прадпрымальнасць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**

**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**

**НАВІЦКІ Г.В.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні

**БАЙКОЎ В.М.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце

**АЦЯСАЎ А.Я.,** старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў

**СЦЕПАНЕНКА А.М.,** адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**ПРЭДКА С.У.,** старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці

**МАКСІМЕНКА С.А.,** старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:**

**Наталля КАРПЕНКА.**

***Кантактны тэлефон 292 21 03.***

Закрытая ўстанова

# ДОМ З МОХАВЫМ ДАХАМ

**Грамадскае аб'яднанне «Чарнобыльскі бусел» разам са студэнтамі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і выдавецтвам «Траско» правяло дабрачынны дзень у Барысаўскім псіханеўралагічным доме-інтэнаце, што ў вёсцы Тарасікі.**

...«Чарнобыльскі бусел» даўно займаецца дабрачыннасцю, падтрымкай самых розных людзей і арганізацый, аднак інтэрнату ў Тарасіках — асобны клопат. Старшыня аб'яднання Наталля Парукава не адзін год дапамагае тутэйшым жыхарам. Многае з таго, што апошнія бачаць і чым карыстаюцца кожны дзень, забяспечана, як кажуць, з яе ўдзелам. На жаль, карыстальнікі не ў стане ацаніць парыў іншай душы — па прычыне няпростых захворванняў уласнай. Затое саму Наталлю Мікалаеўну тут добра ведаюць і пазнаюць. Як толькі яна выйшла з машыны, некалькі насельнікаў кінуліся да яе з радасным узбуджэннем — абняць, пацiскаць за рукі. У мяне, прызнацца, перахапіла дыханне: раптам гэтым людзям захочацца абняць і мяне? Хоць я і ведала, куды ехала, але ж да цеснага братання была не гатовая. Шчырыя людзі, напэўна, нейкім чынам адчулі маю «закрытасць», і дакраналіся да мяне з пэўнай асцярожнасцю... Пазней я даведалася, што тут ёсць і такія хворыя, з якімі асцярожнай варта быць мне...

Наталля Мікалаеўна не прыязджае сюды з пустымі рукамі. На гэты раз падарункі былі арганізаваныя студэнтамі перакладчыцкага факультэта лінгвістычнага ўніверсітэта, дзе на працягу двух месяцаў збіралася адзенне, абутак, гігіенічныя наборы, нават магнітафоны і грошы, на якія былі набыты прысмакі. Выдавецтва «Траско» перадало друкаваныя падарункі — кнігі, буклеты, часопісы. Наогул частка падарункаў была сфарміравана паводле пажаданняў жыхароў інтэрната. Студэнты паспрабавалі не адступаць ад замоўленага. А ў дадатак прывезлі ў тутэйшы дом культуры лялечны спектакль ды спевы. Пасля ведовішча была сумесная творчасць: насельнікі інтэрната выраблялі разам са студэнтамі арыгамі — маленькіх журавоў, знак сяброўства і міласэрнасці. Жаночай палове яшчэ і прыгожы манікюр зрабілі. Ніколі не думала, што гэта працэдура можа быць такой кранальнай.

**«Грамадства хацела б забыцца на гэтых людзей і не разважаць над іх існаваннем на белым свеце. Аднак такія людзі жывуць. Шмат у чым дзякуючы тым адзіночкам, хто не падтрымлівае падобную пазіцыю.»**

...У Мінскай вобласці пяць інтэрнатаў псіханеўралагічнага профілю. Але толькі адзін — У Тарасіках — мае такую доўгую гісторыю, такое няўдалае геаграфічнае размяшчэнне і, бадай, самыя сціплыя ўмовы для пражывання. Будынкі, на якіх любіць сяліцца мох, былі ўзведзеныя яшчэ ў 1949-м — для прадпрыемства па здабычы торфу. Адным словам, тут — балота. Месца для жыцця, мякка кажучы, непрыдатнае. Але ж тым не менш, у 1965 годзе, калі торфаздабыча скончылася, пабудовам не далі прапасці. Адкрылі спецыялізаваны інтэрнат. Не думаю, што варта ўяўляць, як жылі тут раней і без таго адрэзаныя ад свету хворыя людзі.

Доўгі час месца было Богам забытае. Пад нагамі чвякала і распаўзалася непрыемная жыжа. Цяпер — цвёрдая зямля, асфальт. Для ўпрыгажэння — альпійскія горкі. Усе будынкі размешчаны кругам, так што з цэнтра добра відаць кожны. Вось галоўны стратэгічны корпус — сталоўка. Сціплая, немаладая, але чыстая, дагледжаная. Абсталяванне мяняецца па меры сілаў і магчымасцяў спонсараў (перш-наперш ірландскіх, галандскіх, англійскіх, амерыканскіх, хоць нельга сказаць, што дапамога гэта рэгулярная і вызначальная ў кантэксце незлічонай колькасці патрэбаў). Не так даўно спонсары падарылі халадзільную шафу, кацёл для варкі.

Сталаванне адбываецца чатыры разы на дзень, у дзве змены. Сталоўка быццам і немалая, але адразу ўсе не сядуць. Пакуль адны распраўляюцца са сваімі порцыямі, нехта абавязкова «тусуецца» ля дзвярэй, назірае за працэсам.

— Лёня ў нас хоць і малы, а тры порцыі праглыне — не заўважыць, — кажа дырэктар інтэрната Віктар Тумакоў. — Гэта не таму, што порцыі недастатковыя... Проста ў некаторых хворых, так бы мовіць, не працуе «механізм насычэння». Але ж хто просіць дабаўкі, заўсёды атрымлівае. Харчаванне ды яшчэ заробак персаналу — вось галоўныя пункты, на якія мы атрымліваем дзяржаўныя грошы. Акрамя таго, у нас ёсць свая падсобная гаспадарка. Трымаем кароў і свіней. Таму малако і мяса амаль цалкам свае. З раслінаводствам — іншая сітуацыя. На балоце ж нічога не расце. Гародніну набываем у гаспадарак... Фрукты даём рэгулярна, згодна з нормамі... Цукеркі — гэта толькі калі спонсары прывязуць...

Асобны корпус — пральня, у якой (дзякуючы ўсё таму ж спонсарству), з'явілася новая пральная машына. Асобна стаяць кацельная і склад (што важна, не пусты). Чатыры карпусы — для пражывання. Два — для 136 жанчын і два — для 134 мужчын ва ўзросце ад 18-ці. У пакоях — мінімалізм. Па чатыры ложкі, шафа або тумбачкі. На вокнах — прыстойны цюль і фіранкі. Сцены, паводле вызначаных правілаў бяспекі, не абклееныя, а пафарбаваныя. Дзе-нідзе новы лінолеўм... Віктар Іванавіч кажа, што такі годны выгляд ва многім забяспечаны Наталляй Мікалаеўнай.








У кожным жылым корпусе прыбіральня — адна на паверх. Цесната — не развярнуцца, але ж чыста... І адзін на паверх пакой для назірання. Назву сваю ён атрымаў з-за адсутнасці дзвярэй. Замест іх — рашотка. У такім пакоі можа знаходзіцца адразу некалькі агрэсіўных, узрушаных чалавек. На момант майго візіту насельнікі пакоя паводзілі сябе ціха. Але ж мяне на ўсякі выпадак папярэдзілі: «Асцярожна, блізка не падыходзьце — яны і кінуцца могуць, і плюнуць...».

...У такія ўстановы людзі трапляюць двума шляхамі. «Вырастаюць» з адпаведнай дзіцячай установы. Гэта — інваліды ад нараджэння. Другая катэгорыя — са звычайнага жыцця.

Вользе — 28 гадоў. У Барысаўскім інтэрнаце яна жыве з 1995 года. Аднойчы, у момант моцнага абвастрэння шызафрэніі, яна забіла родную бабулю. Маці давялося змірыцца з працяглым лячэннем дзяўчынкі ў Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы, адкуль яна ўжо не вярнулася дадому. Жыхары дома ў Тарасіках сталі для яе сваякамі... А немаладую ўжо Таццяну калісьці кінуў хлопец. Нешта ў дзяўчыне тады зламалася. У Барысаве жыве яе родная сястра, часам наведвае, але забраць Таццяну ў хатнія ўмовы не ўяўляецца магчымым.

Івану — 24, шэсць з якіх ён жыве ў інтэрнаце. Бацькі ў яго цудоўныя... Але ж ад няшчасця аказаліся неабароненыя. Пасля перанесенага менінгіту ў хлопца развілася шызафрэнія, параноідная форма... У момант абвастрэння Іван кінуўся на блізкіх з нажом... А 58-гадовы Міхаіл — у мінулым архітэктар, атрымліваў другую вышэйшую адукацыю. Днём вучыўся, ноччу працаваў, каб забяспечыць сям'ю — жонку і дзвюх дачок. Праз некалькі месяцаў такога напружання «ўзнікла» ўсё тая ж злашчасная шызафрэнія. Міхаіла і накіравалі... да людзей на балоце...

— Усе нашы пацыенты — псіхахронікі, — тлумачыць урач-псіхіятр Надзея Маслоўская. — Іх дыягназы — прыроджаная разумовая адсталасць, шызафрэнія, дэменцыі, хвароба Даўна, хвароба Альцгеймера... Гэтыя дыягназы ім былі выстаўленыя ў Рэспубліканскай псіхіятрычнай бальніцы, дзе выдалі адпаведныя накіраванні ў медыкарэабілітацыйную экспертную камісію. Яна і прымае рашэнне аб своеасаблівай ізаляцыі... Для таго, каб падтрымліваць хворых у стане, калі яны могуць хоць нейкім чынам кантактаваць з навакольнымі, ім патрэбна медыкаментозная карэкцыя асноўнага захворвання. Яны не заўсёды могуць сказаць, што іх турбуе, таму мы праводзім рэгулярныя агляды. Раз на год — паглыбленыя, з падключэннем вузкіх спецыялістаў. Лорурача, афтальмолага, неўрапатолага, хірурга і іншых, якія прыязджаюць з раённай бальніцы...

Асноўная група прэпаратаў, неабходных для хворых такога профілю, — нейралептыкі. Іх наогул вельмі шмат, і ніводзін з відаў не вырабляецца ў нашай рэспубліцы. Закупляюцца за мяжой. Прэпараты высокай эфектыўнасці каштуюць вельмі і вельмі дорага. Па зразумелых прычынах інтэрнат не мае магчымасці набываць шырокі спектр такіх лекаў.

...Паколькі дыягназы розныя, то немагчыма і разлічыць агульную для ўсіх пацыентаў колькасць грошай, патрэбных для набыцця лекавых прэпаратаў. Але сёе-тое з параметраў рэгламентавана. На кожнага пацыента — не менш за 7 кв. метраў жыллёвай плошчы. Агульная сума, у якую абыходзіцца пражыванне аднаго чалавека — 654 тысячы рублёў.

Кожны пацыент, як вядома, атрымлівае пенсію па інваліднасці, з якой 90 працэнтаў застаецца ў дзяржавы, а 10 працэнтаў належыць непасрэдна самому хвораму. Зразумела, што распараджацца грашыма тутэйшае насельніцтва не здольнае. Таму па меры неабходнасці інтэрнат набывае кожнаму на яго сціплую суму што-небудзь з ежы, напрыклад.

— Фактычна я з'яўляюся апекуном для ўсіх жыхароў інтэрната, — кажа Віктар Іванавіч. — Ахоўваю іх правы, расход асабістых грошай, а таксама не дазваляю сваякам хворых пазбавіць апошніх той жа жыллёвай плошчы. Здараецца, прыязджаюць сваякі, просяць, каб мы выдалі даведку, якая дапаможа ім прадаць кватэру, дзе прапісаны хворы. Мы такіх даведак, безумоўна, не выдаём... Быў выпадак, 74-гадовую бабулю завочна «выдалі замуж» за 30-гадовага мужчыну. Маёмасць перапісалі на «мужа». Падман быў выкрыты, і сітуацыя выпраўленая... Але што хаваць, ёсць сваякі, якія проста чакаюць смерці блізкага чалавека. Каб свабодна прыбраць да рук яго долю. Бывае і такое, што сваякі адмаўляюцца пахаваць памерлага. Тады інтэрнат бярэ гэта на сябе. У нас ёсць свае могілкі. Усё ж такі частка пацыентаў не мае родных...

Як толькі хто памірае, на яго месца тут жа прысылаюць навічка. А навічкоў гэтых на чарзе не так і мала. Жыццё на балоце працягваецца.

У гэта балота ўкладзена шмат грошай. Бягучы рамонт фактычна не спыняецца, а паступова пераходзіць з аднаго корпуса ў наступны. Вырашана на сёння і пытанне пажарнай бяспекі — на належную супрацьпажарную сістэму Камітэт па працы і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама выдаткаваў сур'ёзную суму.

Паводле слоў дырэктара інтэрната, калісьці, гадоў восем таму, у інтэрната былі шэфы — прадпрыемства абласнога падпарадкавання Мінскі лікёра-гарэлачны завод. Аднак раптам яго перадалі ў рэспубліканскую ўласнасць, і адсутнасць яго падтрымкі стала вельмі адчувальнай. Сёння дом-інтэрнат разлічвае пераважна на сваю падсобную гаспадарку, мясцовы калгас, абласны камітэт па працы і сацыяльнай абароне ды... спонсараў.

...Наталля Мікалаеўна пакідала Тарасікі з лёгкім сэрцам і думкамі пра наступную паездку... Студэнткі прыйшлі да высновы, што людзі, з якімі яны рабілі папяровых жураўоў — зусім не страшныя... Мне думалася: як прыемна назіраць за работай людзей, якія не спадзяюцца атрымаць штосьці ўзамен.

Пакідала я Тарасікі без абяцання абавязкова вярнуцца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота Канстанціна НЕТЫЛЁВА.**
*Барысаўскі раён.*

# ПЕРАРАЗЛІК ЗА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ — У РАСТЭРМІНОЎКУ

**Вялікія плацяжы за электрычнасць, якія не так даўно выставілі асобным спажыўцам, для пераважнай большасці з іх — сапраўдная праблема. Паколькі павелічэнне аплаты датычыцца найбольш неабароненых катэгорый насельніцтва.**

Справа ў тым, што ўпарадкаванне сістэмы льгот датычылася ў тым ліку і плацяжоў за электрычнасць. Раней льготныя тарыфы (50 працэнтаў вызначанага нарматыву) распаўсюджваліся на ўвесь спажыты аб'ём электраэнергіі. А з пачатку гэтага года — толькі ў межах адпаведнага дзяржаўнага сацыяльнага стандарту: 60 кілават-гадзін у месяц на чалавека ў кватэрах з газавымі плітамі і 90 Квт/гадз. — з электрычнымі плітамі.

Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» начальнік упраўлення збыту энергіі «Белэнерга» Аляксей Багушэвіч, новы парадак разлікаў за электрычнасць павінны былі ў вызначаным парадку зацвердзіць аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам. Але на месцах рашэнні своечасова не прынялі. У выніку чаго ўзнікла неабходнасць у пераразліку.

Як вынікае са зваротаў у рэдакцыю нашых чытачоў, асобным жыхарам звыш вызначанай сумы неабходна было даплаціць 60—100 тысяч рублёў, а то і больш. Прычым даплату патрабавалі адразу, інакш — за кожны пратэрмінаваны дзень пагражала налічэнне пені. Як растлумачыў Аляксей Багушэвіч, розніца пры пераразліку льготных плацяжоў за электрычнасць можа быць выплачана часткамі — у растэрміноўку на пэўны час. Такім чынам неабходна рэгуляваць выплату адпаведных сумаў, якія ў шэрагу выпадкаў на працягу года (у асобных рэгіёнах рашэнне ўсё ж прынялі больш аператыўна) «набеглі» звыш нарматываў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское производственно-торговое унитарное предприятие «Рыбхоз «Локтыши» РПТУП «Рыбхоз «Локтыши» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Слуцксортсемовощ» РУП «Слуцксортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Оптико-механическое республиканское унитарное предприятие "Зенит" ОМ РУП "Зенит" Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное транспортное предприятие «Брестгрузавтосервис» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Завод «Оптик» РУП «Завод «Оптик» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Рогачевский завод «Диапроектор» РУП «Рогачевский завод «Диапроектор» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское производственное унитарное предприятие «Житковичское» РУП «Житковичское» Министерство энергетики Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 225452, Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Большие Круговичи | 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Козинцева-Прокопчика, 1 | 222410, Минская обл., г. Вилейка, ул. Чапаева, 26 | 224003, г. Брест, ул. Л-та Рябцева, 45 | 231300, Гродненская область, г. Лида, ул. Машерова, 10 | 247675, Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Ленина, 142 | 247988, Гомельская обл., Житковичский р-н, пос. «Червонное» |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Рыбоводство | Розничная и оптовая торговля семенами | Производство оптической и оптико-механической продукции, производство частей и принадлежностей автомобилей и их двигателей, производство приборов контроля и регулирования технологических процессов, производство оптических прицелов | Пассажирские и грузовые перевозки | Производство оптических приборов, осветительного оборудования, стекла и изделий из стекла | Производство оптических приборов, приборов наблюдения, прицелов; обработка металлических изделий с использованием основных технологических процессов машиностроения | Производство торфяных брикетов |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| Численность работающих, чел. | 110 | 15 | 1089 | 449 | 1080 | 1722 | 315 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 24 580 740 800 | 25 621 600 | 86 096 634 800 | 30 544 887 894 | 34 726 782 942 | 55 911 226 800 | 16 990 938 800 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 23 181 432 006 | 185 278 413 | 88 016 156 847 | 29 332 529 004 | 38 435 401 079 | 57 211 412 562 | 15 451 585 892 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 2997 | 0,4775 | 10,3339 | 23,3278 | 44,7509 | 27,6804 | 1101,3811 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет | нет | 2 000 | 7 876 336 | 2 600 003 | нет | 30 297 149 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, рублей | нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 43 922 422 | 2 641 388 | 1 194 382 493 | -564 460 299 | 1 551 038 438 | 2 374 101 432 | 956 819 597 |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность кредиторская | 446 596 745 | 239 564 338 | 6 798 040 966 | 4 160 952 272 | 3 385 114 424 | 5 888 649 939 | 257 584 047 |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность дебиторская | 41 107 972 | 183 869 461 | 497 745 174 | 15 293 754 133 | 421 607 100 | 1 145 427 420 | 2 028 099 301 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Республиканское унитарное предприятие «Сморгонский завод оптического станкостроения» совместно с республиканскими унитарными дочерними предприятиями «Испытатель», г. Сморгонь, «Нива-ЗОС», г. Сморгонь, «СЗОС-Актив», г. Сморгонь, «СЗОС-Плазмовак, г. Сморгонь и «ВЛТСЗОС», г. Минск, РУП «СЗОС» Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 11 г. Пружаны» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 11 г. Пружаны» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 8 г. Береза» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 8 г. Береза» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее предприятие «Брестский автобусный вокзал» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДП «Брестский автовокзал» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 12 г. Столина» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 12 г. Столина» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 10 г. Лунинца» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автопарк № 10 г. Лунинца» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автобусный парк № 1 г. Бреста» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автобусный парк № 1 г. Бреста» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Гродносортсемовощ» РУП «Гродносортсемовощ» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
| 231000, г. Сморгонь, ул. Я. Коласа, 78 | 224133, Брестская обл., г. Пружаны, ул. Лазо, 6 | 225210, Брестская область, г. Береза, ул. Ленина, 1 | 224016, г. Брест, ул. Мицкевича, 35 | 225510, Брестская обл., г. Столин, ул. Терешковой, 60 | 225644, Брестская область, г. Лунинец, ул. Баженовой, 6 | 224020, г. Брест, ул. 2-я Заводская, 6 | 231301, г. Лида, ул. Северный промузел, 14 |
| Производство продукции машиностроения | Транспорт | Перевозки автобусами, перевозки грузов, технические испытания и исследования | Деятельность автовокзалов по перевозке пассажиров | Автомобильные перевозки пассажиров и грузов в пределах Республики Беларусь | Перевозка грузов и пассажиров автомобильным транспортом, услуги по ремонту и техническому обслуживанию автотранспортных средств | Перевозки автобусами | Оптовая торговля зерном, семенами и кормами для животных, розничная торговля семенами и удобрениями |
| Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 230023, г. Гродно, ул. 17 сентября, 39 |
| 1080 | 173 | 122 | 84 | 212 | 150 | 714 | 33 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 14 499 232 000 | 2 388 259 379 | 1 574 979 398 | 685 999 600 | 2 731 801 600 | 2 781 137 467 | 20 173 995 600 | 1 976 471 200 |
| 18 749 065 982 | 8 077 142 281 | 3 559 349 755 | 600 063 299 | 3 256 022 175 | 7 424 568 684 | 24 936 044 166 | 1 790 039 585 |
| 35,3763 | 5,4334 | 7,38 | 0,6488 | 6,9067 | 4,014 | 16,7859 | 4,906 |
| 40 313 202 | нет | нет | нет | нет | 1 021 790 | нет | нет |
| нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| 443 639 337 | 185 406 485 | 109 656 711 | 68 505 617 | 12 339 163 | 236 194 439 | - 2 383 427 507 | -252 385 408 |
| 13 315 948 297 | 159 877 774 | 143 806 996 | 272 858 308 | 1 097 544 800 | 138 219 383 | 1 328 521 789 | 513 029 154 |
| 1 165 308 254 | 160 288 015 | 210 140 576 | 16 219 415 | 399 765 985 | 223 659 311 | 627 567 074 | 47 101 941 |

ЗВЯЗДА 17 снежня 2008 г.

# СПРАВА Ў «ТЭЛЕ»

**Сёння — Дзень беларускага кіно. Яго нельга назваць святам, якое ўвесь час з намі. Ужо таму, што штодня тэлебачанне не здзіўляе нас новымі працамі беларускіх кінавытворцаў. А самы просты шлях да сэрцаў айчыннага гледача пралягае праз тэлеэфір.**

**На кінастудыі гэта разумеюць, калі мяркаваць па грандыёзных планах. Але разам з тым ёсць упэўнены запал і аптымістычны настрой, з якім прадстаўнікі кінастудыі разважаюць пра будучыню. І гэта не можа не абнадзейваць, асабліва на фоне асцярожных і нават збянтэжаных заўваг расійскіх кінаасобаў пра тое, што з-за крызісу спыняецца вытворчасць многіх праектаў — фільмаў і тэлесерыялаў. Страта апошніх моцна ўдарыць і па беларускіх тэлегледачах, для большасці з якіх кіно — гэта найперш тое, што паказваюць па тэлебачанні. І вось тут высока трымае галаву і абуджаецца «Беларусьфільм», які выпускае адзін тэлефільм за другім... Мара? Спадзяванні і планы? Ці няўжо сапраўды прыспеў час, калі сітуацыя можа скласціся на нашу карысць? Прынамсі, калі адказныя асобы былі не супраць паразважаць пра перспектывы беларускага тэлевізійнага кіно, то ў гэтым усё ж ёсць нешта больш падобнае на рэальнасць, чым мары пра з'яўленне вялікага фільма. Магчыма, вытворчасць тэлекіно — гэта выйсце для беларускай студыі...**

## Прыбытковы бізнэс

Адна з істотных асаблівасцяў вытворчасці тэлефільмаў у тым, што выдаткі на іх акупляюцца. Паказ расійска-беларускага фільма «У чэрвені 41-га» 9 мая на Першым расійскім тэлеканале апраўдала ўсе ўкладзеныя ў вытворчасць сродкі. І нават калі фільм зроблены не вельмі якасна, то пасля якога-небудзь пятага паказу ён акупляецца ўсё роўна. Што для нас вельмі істотна: гэта ўжо праца не «ў мінус». Такім чынам, эканоміка відавочна — «за». Як не будуць «супраць» і тыя, хто можа патэнцыяльна мець дачыненне да вытворчасці тэлекіно: заўсёды хочацца быць занятым дзе-небудзь, а не быць у бестэрміновым творчым прастоі. А людзі, якія праводзяць доўгія зімовыя вечары ля экрана, сваё «так» выражаюць націсканнем кнопачак на пульце тэлевізара. Вось яны, іх інтарэсы, іх узровень і з'яўляюцца самым загадкавым звяном у гэтым ланцужку. Таму што гледачы — розныя. А статыстыка пакідае толькі ад 3 да 6 працэнтаў ад усёй глядацкай аўдыторыі за інтэлектуаламі, якія ад кіно чакаюць не толькі забавы, але і мастацтва. І гэтай лічбай сёння можна апраўдаць нібыта ўсё.

Спроба гэтага апраўдання прыйшла да нас праз расійскія тэлеканалы. І чаму гэта так, а не інакш, найлепшым чынам патлумачыла аўтарытэтны тэлеаглядальнік газеты «Известия» Ірына Пятроўская, якая была госцяй нашага кінафестывалю. Працытую яе дзеля таго, каб потым зразумець, што прынцыпова іншае ў матывах і планах беларускіх кінавытворцаў: «Тэлекіно — гэта топка, у якую дровы можна закідваць няспынна. Разважаць пра тое, мастацтва ці не мастацтва гэтыя дровы — нават смешна. Раз у сезон ці раз у два-тры сезоны кампанія, якая сябе паважае, дазваляе дзеля самапавагі нейкія рэпутацыйныя праекты, калі здымаецца нешта вышэйшае за пояс. З лексікі цяперашніх тэлевізійных заказчыкаў знікла слова «фільм», «твор», «карціна». Гэта сапраўды прадукт, які трэба прадаць выгадна. Гэта ўсё робіцца дзеля рэйтынгу канала, які вызначае адпаведна кошт рэкламы. Пра вынікі ніхто не думае, таму ў нас на экране па-ранейшаму няма сапраўднага героя. Мы нават не ведаем, якім ён можа быць...»



«Снайпер»



«Пакуль мы жывыя»

І тут хочацца сказаць: пачакайце, аднак жа расійскі Бязрукаў стаў супергероем тэлефільма, які быў зняты сумесна з Беларуссю... Ці гэта толькі ў Беларусі ён стаў супергероем фільма «У чэрвені 41-га»? І як жа тады расійскія зоркі, якія павінны стаць героямі іншых тэлепрэм'ер — Данііл Співакоўскі ў фільме «Цень самурая» Віталя Чацвярыкова і Дзмітрый Пяўцоў, які здымаецца ў чатырохсерыйнай ваеннай стужцы «Снайпер» Аляксандра Яфрэмава — напэўна ж, іх запрашалі дзеля таго, каб прапанаваць нам вобразы сапраўдных герояў сапраўднага кіно? А ў Беларусі апошняе спалучэнне ў дачыненні да тэлекіно не ставяць пад сумненне.

## Не кан'юнктурная кінастудыя

Гаворачы пра перспектывы беларускага тэлекіно, генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Замяталін адзначыў: «Тэлевізійнае кіно робіцца значна хутчэй, яно больш умоўнае. Але мы перад сабой паставілі задачу: не спрашчаць да такой ступені, калі тэлевізійнае кіно носіць выключна камерцыйны характар і даведзена да крайняй ступені наіўнасці. Скажам, як 300 серый вядомых аргенцінскіх ці бразільскіх серыялаў. Наша задача — зрабіць такое кіно, якое адпавядала б духу часу, гаварыла на сучаснай кінамове, каб яно адказвала на выклікі сучаснасці і раскрывала відавочныя балючыя кропкі. І ні кроку назад. Мы не кан'юнктурная кінастудыя. Для нас рэпутацыя значна даражэйшая. Мы ніколі не будзем змешваць паняцці, што больш важна: бізнэс ад кіно ці творчая складовая ў кінавытворчасці. Другое для нас адназначна важней. Зараз настаў момант ісціны. Надышла ў глабальным маштабе паўза, калі для атрымання пэўных прыбыткаў трэба паказаць сябе перад грамадствам: у якім ты насамрэч стане...»

Як вядома, кінастудыя зараз знаходзіцца ў стане рэканструкцыі. Ідзе працэс поўнай замены абсталявання — праведзена 60 працэнтаў прац у гэтым кірунку. Зроблена лабараторыя камп'ютарнай графікі. Але спецыялізаванае абсталяванне для кіно, у тым ліку тэлевізійнага, будзе закупляцца ў самую апошнюю чаргу (з улікам дынамікі развіцця тэхналогій). Але мала толькі закупіць абсталяванне, трэба навучыць ім карыстацца тых, хто непасрэдна задзейнічаны ў кінапрацэсе. З сярэдзіны наступнага года на «Беларусьфільме» збіраюцца рабіць самастойна ўсё тое ж, што робіць «Масфільм», усе тыя паслугі, за якімі сёння звяртаюцца туды прадстаўнікі Беларусі.

Але рапартуючы пра паказчыкі, кіраўніцтва кінастудыі называе лічбу ў 10 фільмаў, якія былі выпушчаны сёлета. На кінавытворчасць сёлета пайшло 18 мільярдаў рублёў. У наступным годзе сродкаў абяцаюць яшчэ больш — 28 мільярдаў. І фільмаў на два больш. Але ўжо да 2010 года «Беларусьфільм» мае намер дагнаць... сярэднестатыстычны паказчык савецкіх часоў і выпускаць 15 карцін за год! Колькі



з іх будзе тэлевізійнага фармату, пакуль сказаць немагчыма, але відавочна, што істотным вынікам мадэрнізацыі кінастудыі стане магчымасць выкарыстоўваць тэлевізійнае кіно ў перспектыве як плёначнае, пераводзячы лічбу на плёнку, а можна, будзе рабіць і наадварот: кожная карціна, знятая на плёнцы, абавязкова будзе пераводзіцца ў тэлевізійны фармат. Гэта дыктуецца камерцыйнымі перавагамі — адкрываецца магчымасць не абмяжоўвацца паслугамі пракатных арганізацый. Такім чынам кіно працэй дойдзе да вялікай колькасці тэлегледачоў, якія часам не могуць пабываць у кінатэатры, часам з прычыны адсутнасці кінатэатра ў іх мясцовасці.

***Перспектывы беларускага тэлевізійнага кіно каментуе Людміла Саянкова, кіназнаўца, загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі БДУ:***

*— Ці здольныя нашы творчыя кадры зрабіць якаснае тэлевізійнае кіно, я пакуль не бяруся сказаць. Але рабіць тое, што было зроблена да іх іншымі аўтарамі ў іншых краінах і карміць нас той жа «гумкай», мне здаецца, не самы эфектыўны шлях. У Беларусі могуць з'яўляцца свае тэлесерыялы: мы маем цікавую гістарычную літаратуру, ёсць багатыя на інтрыгі творы Караткевіча, цудоўная проза нашых класікаў. Калі б кіраўніцтва кінастудыі і аўтары здагадаліся ўзяць за аснову класічны твор літаратуры, паводле яго зрабіць сцэнарый, каб у ім была гісторыя, і яна была б сапраўдным відовішчам, цікавым, накіраваным у тым ліку і на масавага гледача, а з іншага боку за ёй стаяла б нацыянальная культура — гэты шлях даў бы свае вынікі. І ў камерцыйным плане, і ў культурным, маральным, у плане нацыянальнай самасвядомасці. Маглі б атрымацца фільмы, якія стваралі б пэўны эфект кансалідацыі ў грамадстве. Пакуль гэтага не відаць, ідуць па шляху найменшага супраціўлення, прапануючы тое, што даецца ў выглядзе клішэ: хтосьці за кімсьці павінен гнацца, забіваць, нешта пераадольваць. Але гэта ўсё не мае ніякага дачынення ні да гісторыі, ні да часу, ні да чалавечых адносінаў. Здаецца, нават масавы глядач ужо наеўся такога прадукту. Калі мы ў вялікім тэлесерыяльным моры раптам убачылі тэлевізійнае якаснае кіно, якім была «Ліквідацыя» Сяргея Урсуляка, усе адразу спыніліся ля экрана і глядзелі БТ. Гэта было, з аднаго боку, масавае відовішча, а з іншага — культурная падзея, якой становіцца якасны фільм. Таму што нам прапанавалі не тэлесерыяльнае «мыла», а моцны фільм, дзе была свая прыгодніцкая жанравая аснова, але там былі паказаны і чалавечыя характары, сюжэт прымушаў увесь час суперажываць. Ёсць настальгія па кіно з чалавечым тварам. Гэта той самы ключ, які прывёў бы нас да нейкага выніку. Пакуль гэтага няма...*

## Казкі для дарослых

Прынамсі, у згаданыя вышэй застойныя савецкія часы гэта формула працавала бездакорна. З таго часу, калі пачалася вытворчасць тэлевізійных фільмаў на кінастудыі «Беларусьфільм», і дзесьці да пачатку 90-х гадоў іх было створана каля 150. Запатрабаванасць іх была відавочная. Потым вытворчасць тэлевізійных фільмаў была спыненая гадоў на дзесяць. Тым не менш, з 2002 года на кінастудыі зноў сталі выпускаць тэлевізійнае кіно: з'явіліся фільмы «Сяброўка-восень», «Пяшчотная зіма», «Тры талеры» і іншыя. Сёлета выйшлі «Цень самурая», «Крапавы бярэт», «Пакуль мы жывыя». Завяршаецца праца над сумесным расійска-беларускім фільмам «Снайпер». І ў студзені рыхтуецца да запуску васьмісерыйны фільм «Замах». У бліжэйшы час кінастудыя збіраецца нас здзівіць і прыгодамі, і меладрамай.

— Падыходы да выбару матэрыялу скіраваныя на тое, каб разглядаць любую тэлевізійную прадукцыю, якая рыхтуецца да «запуску» ў вытворчасць, з пункту погляду кінамастацтва, наяўнасці ў ім вобраза, метафары, — сцвярджае галоўны рэдактар кінастудыі Наталля Сцяжко. — Чым мы кіруемся, калі плануем выпуск тэлефільма? У першую чаргу ў сцэнарыі павінна быць дакладна і цікава расказаная гісторыя. Тэлесерыял разлічаны на сярэднестатыстычную сям'ю. Яго адметнасцю з'яўляюцца дакладна распрацаваныя вобразы герояў, жорсткія рамкі сюжэтнай канвы. Кожная серыя — скончаная гісторыя, але сюжэт не завершаны, у ім заяўка для наступнай серыі. Патрэбны сыход ад рэальнасці ў ілюзію, сыход ад паўсядзённых клопатаў, так званая «казка для дарослых». Герой павінен быць фігурай, якая з'яўляецца на экране як асоба, блізкая і знаёмая для іх, з якой яны ахвотна сустракаюцца па вечарах. У кожнага героя павінен быць свой архетып, які існуе ў гісторыі, каб у гледача быў эфект праўдзівасці і пазнавальнасці: «баба яга», «папялушка» і гэтак далей. Канцэпцыя, на якой трымаецца серыял, нам вядомая з дзяцінства: казкі, якія распавядалі нам бабулі і матулі, маюць тую ж серыяльную структуру, калі мы кожны вечар чакалі новай гісторыі. Але сіла ўздзеяння серыяла ў тым, каб дасягаць мэтаў маральных і грамадскіх.

Шчыра кажучы, не ведаю, як усё гэта можна сумясціць — і мастацтва, і сярэднестатыстычную сям'ю. Але калі каму-небудзь у нас удасца гэта зрабіць — буду адданай прыхільніцай творчасці гэтага рэжысёра. Але хто ён, дзе ён?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

«Еўрабачанне-2009»

## Г, Д, Е і іншыя літары алфавіту

Сталі вядомыя імёны пяці фіналістаў Нацыянальнага тэлевізійнага музычнага праекта «ЕўраФэст». Іх па выніках паўфінальнага канцэрта (выступленне пад фанаграму «мінус адзін» у тэлевізійнай студыі) агучыла прафесійнае журы на чале з народным артыстам Беларусі Анатолем Ярмоленкам. Шанц стаць прадстаўніком Беларусі на «Еўрабачанні-2009» у Маскве атрымалі Пётр Елфімаў, (1) тандэм гурта «Litesound» і Дакоты (2), гурт «Вецер у галаве» (3), спявачкі Дамініка (4) і Гюнеш (5).



1

Як відаць, сярод фіналістаў з'явіліся імёны не толькі не «зорныя», але і зусім новыя на беларускай сцэне — і гэта, мабыць, заканамерна. Паўфінальны канцэрт пацвердзіў тое, што часта паўтаралі суддзі і ўсё ніяк не маглі прыняць некаторыя артысты і прадзюсары: мала проста выйсці на сцэну і праспяваць песню, трэба яшчэ здзівіць, зачапіць слухача. З гэтай задачай, як ні дзіўна, найлепш справіліся якраз навічкі адбору — амаль усе яны былі яркімі, адметнымі, запамінальнымі, у той час як некаторыя папулярныя выканаўцы нібыта зрабілі кальку з сябе саміх — не добрую і не дрэнную, ніякую... І ўсё ж нават пры такім раскладзе барацьба была нялёгкай, а эмоцыі публікі на працягу шоу — непадробнымі і шчырымі.



2

Міні-апытанне сярод артыстаў і прадзюсараў, якія не ўдзельнічалі ў адборы, але з цікавасцю глядзелі яго, паказала: цалкам фінальную пяцёрку не адгадаў ніхто, але пры вызначэнні фаварытаў тры імені называліся аднадушна. Крэслы ламаць за сваіх улюбёнцаў, зразумела, не варта, але дазнацца ў журы, чаму выбар менавіта такі, усё ж не зашкодзіць.



3

— Усцешыла тое, што з'явіліся новыя імёны, якія не проста не згубіліся, выплылі сярод больш як 100 прэтэндэнтаў, але і стабільна выступілі ў паўфінале, — адзначае старшыня прафесійнага журы Анатоль Ярмоленка.

***— Упершыню ў паўфінале апынуліся адразу дзве беларускамоўныя песні, аднак далей ніводная не прайшла. Чаго не хапіла? Няўжо нашы артысты лепш спяваюць на англійскай, чым на беларускай мове?***

— Галоўны крытэрый быў не моўны, а ў першую чаргу музычны. Камусьці банальна не хапіла вопыту, упэўненасці ў сабе. Мы глядзелі ўсе выступленні ў асобным пакоі па тэлевізары, і адразу адзначу, што многія, хто цікава падаў сябе на праслухоўванні ў зале, не змаглі зрабіць тэлевізійнае выступленне таксама пераканаўчым. Яшчэ адзін недахоп — амаль усе празмерна фарсіравалі голас: было многа крыку, а не спеваў. Гэта падвяло і Дакоту з яе сольнай песняй, а вось дуэт з «Litesound» — зусім іншая справа, з гэтага можа атрымацца вельмі добры нумар.



4



5

Мастацкі кіраўнік праекта «ЕўраФэст» Аляксандр Ціхановіч прызнаецца, што ўважліва прагледзеў і праслухаў выступленні 15 паўфіналістаў, але стараўся нікому не аддаваць перавагі. На яго думку, журы ўдалося зрабіць узважаны выбар, адабраўшы кандыдатаў, кожны з якіх можа годна прадставіць Беларусь на конкурсе.

***— Паводле правілаў, фіналісты могуць пры неабходнасці памяняць песню. Такая неабходнасць, па-вашаму, ёсць?***

— Так. Не буду называць імёнаў, але ў фінале варта было б гэта зрабіць. І як след папрацаваць над тым, каб паказаць канчаткова гатовы, цэльны нумар — гэтага заўжды чакаеш, і заўжды ёсць адчуванне незавершанасці.

У фінале нацыянальнага адбору, які адбудзецца ў студзені 2009 года, нагадаем, суддзі права голасу ўжо не маюць — выбар будуць рабіць шляхам тэлефоннага галасавання выключна тэлегледачы. Але, можа, да некаторых меркаванняў суддзяў варта прыслухацца — каб не наракаць потым, што «зноў не тое», «зноў не тыя»? Так ці інакш, паўфінальны канцэрт здзівіў. Цяпер хочацца, каб фінал парадаваў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота БЕЛТА.**

---

## Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | **Производственное республиканское унитарное предприятие «Березинское» РУП «Березинское» Министерство энергетики Республики Беларусь** | **Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «БЕЛГАЗТЕХНИКА» РУП «БЕЛГАЗТЕХНИКА» Министерство энергетики Республики Беларусь** | **Производственное республиканское унитарное предприятие «Минский автомобильный завод» РУП «МАЗ» Министерство промышленности Республики Беларусь** | **Производственное республиканское унитарное торфопредприятие «Колпеница» УП «Колпеница» Министерство энергетики Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное предприятие «Кузнечный завод тяжелых штамповок» РУП «Кузнечный завод тяжелых штамповок» Министерство промышленности Республики Беларусь** |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 222313, Минская обл., Молодечненский р-н, пос. Березинское, ул. Ленина, 10 | 220015, г. Минск, ул. Гурского, 30 | 220021, г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 225312, Брестская обл., Барановичский р-н, пос. Октябрьский, п/о Столовичи | 222161, Минская обл., г. Жодино, ул. Кузнечная, 26 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Производство пластмассовых изделий | Производство контейнерных и сборно-разборных зданий и помещений, машин и оборудования специального назначения | Производство и реализация автомобильной, автоприцепной, автокрановой и пассажирской техники, прицепов к легковым автомобилям, комплектующих изделий, деталей, запасных частей технологического оборудования | Производство торфяных брикетов | Производство готовых металлических изделий или полуфабрикатов путем ковки, прессования, штамповки и прокатки, обработка и покрытие металлов; производство агрегатов, узлов, деталей, запасных частей и технологической оснастки к сельскохозяйственным машинам |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| Численность работающих, чел. | 442 | 308 | 29 133 | 198 | 1719 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 43 313 425 600 | 10 213 209 600 | 2 091 283 745 092 | 8 653 471 200 | 111 315 033 947 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 21 430 289 950 | 6 653 912 532 | 916 434 484 302 | 7 145 341 173 | 79 349 995 847 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 50,8 | 1,53 | 4226,7383 | 591,2 | 46,7 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет | нет | 169 461 841 | нет | 17 562 930 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, рублей | 68 500 | нет | 541 334 482 | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 83 313 999 | 1 434 989 443 | 365 496 504 241 | 335 478 760 | 11 073 696 886 |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность кредиторская | 18 108 961 755 | 1 963 606 678 | 526 165 516 478 | 152 284 211 | 32 580 482 743 |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Задолженность дебиторская | 2 432 326 719 | 75 359 198 | 268 420 982 358 | 431 801 872 | 4 988 617 653 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 6 г. Микашевичи» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 6 г. Микашевичи» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 7 г. Ганцевичи» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 7 г. Ганцевичи» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь** | **Республиканское научно-производственное унитарное предприятие «РАТОН» совместно с республиканским дочерним научно-производственным унитарным предприятием медицинского оборудования «РАТОН-МедТех» и республиканским дочерним сельскохозяйственным унитарным предприятием «Нагороное-Ратон» Государственное предприятие «Ратон» Министерство промышленности Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автобусный парк № 3 г. Пинска» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автобусный парк № 3 г. Пинска» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное производственное предприятие «Витебский картонажно-полиграфический комбинат» РУПП «Витебский картонажно-полиграфический комбинат» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное дочернее транспортное предприятие «Автомобильный парк № 16 г. Кобрина» Республиканского унитарного транспортного предприятия «Брестгрузавтосервис» РУДТП «Автомобильный парк № 16 г. Кобрина» РУТП «Брестгрузавтосервис» Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь** | **Республиканское унитарное предприятие «Гомельский завод пусковых двигателей им. П.К. Пономаренко» РУП «Гомельский завод пусковых двигателей им. П.К. Пономаренко» Министерство промышленности Республики Беларусь** |
| 225687, Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Микашевичи, ул. Привокзальная, 3 | 225431, Брестская обл., г. Ганцевичи, ул. Строителей, 2 | 246044, г. Гомель, ул. Федюнинского, 19 | 225710, Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111 | 210603, г. Витебск, ул. Покровская, 5 | 225304, Брестская обл., г. Кобрин, ул. Советская, 76 | 246646, г. Гомель, ул. Барыкина, 150 |
| Перевозка грузов и пассажиров автомобильным транспортом, медицинское освидетельствование на допуск к работе, услуги по ремонту и техническому обслуживанию автотранспортных средств | Транспортные услуги | Производство электрораспределительной и регулирующей аппаратуры, производство и реализация промышленной продукции | Перевозки автобусом | Полиграфическая деятельность | Перевозки автобусами, перевозки грузовым автомобильным транспортом | Сельскохозяйственное машиностроение, производство двигателей, редукторов и электродов сварочных |
| Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения | Не занимает доминирующего положения |
| 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. | 4-ый квартал 2008 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 |
| 180 | 68 | 1143 | 998 | 91 | 325 | 668 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 2 675 472 800 | 1 288 337 600 | 69 272 425 200 | 14 789 724 400 | 1 668 031 200 | 5 500 000 000 | 41 942 296 000 |
| 7 710 780 392 | 1 757 870 741 | 79 524 222 051 | 19 886 729 764 | 1 506 484 572 | 5 530 168 784 | 40 004 359 407 |
| 5,5387 | 4,1051 | 610,2215 | 10,0752 | 1,6815 | 3,4695 | 44,7545 |
| нет | нет | 626 379 866 | 5636 | нет | нет | нет |
| нет | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| 3 764 005 | 126 643 428 | 266 158 608 | 340 695 810 | 43 779 074 | 108 325 116 | 1 158 979 230 |
| 148 439 116 | 422 979 483 | 4 000 693 329 | 785 587 174 | 699 733 671 | 215 656 741 | 6 195 675 820 |
| 346 394 721 | 144 946 860 | 3 207 486 047 | 313 884 808 | 436 529 222 | 275 403 612 | 468 124 561 |

Во даюць!

# У БАРАНАВІЧАХ ВАДА З-ПАД КРАНА ЗАРАДЖАНАЯ... МУЗЫКАЙ

**Кожную раніцу Анатоль Калінін выпівае шклянку вады, якая зараджана музыкай. А каму ж яе найперш піць, як не дырэктару КУВП «Водаканал», які гэтай вадой забяспечвае цэлы горад. Вось я і прыйшоў да Анатоля Мікалаевіча, каб усё высветліць і паставіць кропку над «і», бо ў СМІ ўзняўся вялікі шум. Маўляў, у Баранавічах народ ужывае нейкую асаблівую ваду — зараджаную станоўчымі эмоцыямі.**


Тэхнолаг Ірына РОЎБА з крышталямі вады.


Анатоль КАЛІНІН са шклянкай «музычнай» вады.

Чаго ў наш час толькі не давялося бачыць. Ваду зараджаў Чумак, і мільённая аўдыторыя, выставіўшы слоікі з вадой перад тэлевізарам, прагна сачыла за мужыком на экране, які махаў рукамі і пыхкаў. І яшчэ стаяць у вушах хвацкія песні Кадышавай — гэта пад іх каровы на калгасных фермах павінны былі даваць больш малака. Адчуўшы мой скептычны настрой, А. Калінін сказаў:

— Карову напачатку трэба накарміць добра ды пастарацца, каб па калені ў гнаі не стаяла, а ўжо потым яе даіць пад музыку — вось з гэтага трэба пачынаць. У нас часта замест таго, каб прыкласці рукі, спадзяюцца на нейкі цуд.

***— А хіба вада, якая рэагуе на музыку, гэта не цуд? І ўвогуле, як вам прыйшла такая ідэя?***

— Давайце ўсё разгледзім па парадку. Вада, зараджаная музыкай, — гэта, можна сказаць, у жыцці нашага прадпрыемства адзін з завяршальных акордаў, а каб прыйсці да гэтага, давялося папрацаваць. Усё пачалося з рэканструкцыі гарадскога водазабору, з праграмы «Чыстая вада».

***Ад аўтара:*** *Баранавіцкі КУВП «Водаканал» з'яўляецца лепшым прадпрыемствам краіны ў сваёй галіне. Падчас рэканструкцыі яно было забяспечана найноўшым імпартным абсталяваннем, якое ў спалучэнні з высокай працоўнай дысцыплінай у калектыве дало магчымасць сертыфікаваць пітную ваду, а гэтым не можа пахваліцца ніводзін горад краіны. Прынамсі, мне так на прадпрыемстве сказалі. Але паслухаем дырэктара.*

— А зараз наконт ідэі зарадкі вады музыкай. Гэта ідэя распрацаваная вучонымі на Захадзе, і нам засталося толькі ўкараніць яе ў жыццё. Вада — жывы арганізм, і да яе неабходна адносіцца трапятліва. Мы ставілі задачу стварыць атмасферу, якая пазітыўна ўплывала б на людзей, што маюць дачыненне да гэтай вады.

***— Анатоль Мікалаевіч, як я зразумеў, вада, якая паступае ў кватэры нашага горада пасля апрацоўкі яе музыкай Моцарта, Бетховена ці Шапэна, ужо іншая, чым была раней? У гэта можна верыць?***

— Верыць ці не верыць, кожны вырашае сам. Многія людзі вераць у сілу святой вады і, напэўна, ім гэта дапамагае жыць у нашым бурлівым свеце. Разам з тым хачу падкрэсліць адну акалічнасць. Вада ўжо сама па сабе стварае музыку, бяда ў тым, што мы яе часта не чуем. Дождж, ручай, вадаспад ці фантан хіба не ствараюць своеасаблівыя мелодыі? А калі паглядзець, як набягаюць на бераг марскія хвалі, то ўзнікае адчуванне вечнасці. Рака, наадварот, нагадвае пра імклівасць часу. Крыніца таксама ўздзейнічае на чалавека. У вады вялікая сіла, і не толькі псіхалагічна яна ўплывае на нас. На захадзе Беларусі насельніцтва не ведала халеры і чумы, эпідэмій, якія лютавалі ў свой час у Заходняй Еўропе ды і ў іншых рэгіёнах свету, а чаму? Таму што ў Заходняй Беларусі залягае магутны пласт крэмнію, які і абеззаражвае ваду. Наша вада «Веда», разлітая па бутэльках, можа захоўвацца год і болей.

***Ад аўтара:*** *На прадпрыемстве наладжаны выпуск вады «Веда», насычанай крэмніем. Звычайная негазаваная вада разліваецца па бутэльках і карыстаецца павышаным попытам. Толькі ў сталіцы яна рэалізуецца ў 33 гандлёвых пунктах. Аднойчы «Веда» прастаяла ў цёмным месцы 4 гады і не згубіла сваёй якасці. Узгадаем, што тэрмін захоўвання каньяку пры пэўнай тэмпературы — 2 гады.*

***— Убачыўшы, якія ідэальныя ўмовы створаны для працы на вашым прадпрыемстве і які тут парадак, я падумаў, што зарадка вады музыкай не была самамэтай.***

— Безумоўна, самае важнае — якасць вады, а ў нас кантроль пітной вады ідзе па 55 паказчыках. І гэта не толькі колер, смак і пах, а мікрабіялагічныя, фізікахімічныя... паказчыкі, за імі сочаць супрацоўнікі хімічна-бактэрыялагічнай лабараторыі пітной вады. Вытрымаць усе кантрольныя паказчыкі — гэта важна і нам удаецца. Вось сёлета прадпрыемства стала лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь 2008 г.». А музыка — гэта як своеасаблівае дапаўненне да якасці нашай вады. Той штрых, якога часам не хапае ў мастацкім творы. У нас ніякіх сумненняў не было, мы ведалі, што вада наша ад музыкі толькі палепшыцца, можна сказаць, акультурыцца, і гэта пры тым, што прадпрыемства не панесла ніякіх фінансавых страт — атрымала толькі аддачу. Але яшчэ раз падкрэслю, што найперш — якасць пітной вады, а затым музыка.

* * *

Мне паказвалі здымкі крышталёў вады, якія быццам бы мяняюцца пад уплывам музыкі. Калі гучыць мелодыя Моцарта, крышталі маюць ідэальную форму зоракснежынак, а вось ад «цяжкага металу» губляюць форму, ператвараюцца ў камякі. Аспрэчваць не буду — магчыма, гэта і так, але мяне кранула яшчэ адзін факт. На прадпрыемстве мяне суправаджала па аддзелах ды ўчастках спецыяліст па інфарматыцы і ідэалагічнай рабоце Тамара Калініна, якая размаўляла толькі па-беларуску, вось і падумалася: а каб тую ваду зараджаць не толькі класічнай музыкай, але і родным словам?

Паверне чалавек кран у сваёй кватэры, глыне акультуранай вады — і нешта ў душы яго варухнецца, адразу адчуе сябе беларусам. А калі такую ваду піць кожную раніцу?!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

POST factum

## ПАРАДОКС: ЖАНЧЫНАМ РЭГУЛЯРНЫ СЭКС ШКОДНЫ, А МУЖЧЫНАМ ВЕЛЬМІ НАВАТ НА КАРЫСЦЬ

**Занятак сэксам не меней за адзін раз на тыдзень можа падоўжыць жыццё мужчыны да васьмідзесяці гадоў, сцвярджаюць тайваньскія вучоныя. Вось толькі з жанчынамі ўсё інакш, даказваюць вынікі даследаванняў.**

Каб на 50 працэнтаў павялічыць шанц перажитць 80-гадовую мяжу, мужчыну дастаткова раз на тыдзень уступаць у палавую сувязь, сцвярджаюць вынікі праведзенага даследавання. Рэгулярныя практыкаванні падобнага роду на 50 працэнтаў зніжаюць рызыку смерці ад інсульту, на 30 працэнтаў — ад сардэчнага прыступу і на 40 — ад дыябету.

Параўнальны аналіз жыцця і часу смерці пажылых мужчын паказаў, што тыя, хто жыў у адзіноце, часцей паміраюць раней, чым іх надзеленыя ўвагай жанчын сябры. Калі мужчына застаўся без жонкі або палюбоўніцы ва ўзросце 65 гадоў, то верагоднасць яго смерці да 80-га дня нараджэння павялічваецца на цэлых 70 працэнтаў.

І прычынай таму, як мяркуюць спецыялісты, — тэстастэрон — гармон, узровень якога ўплывае на ўвесь арганізм мужчыны ў цэлым. Абследаванне 800 мужчын ва ўзросце ад 50 да 90 гадоў прадэманстравала, што чым ніжэйшыя паказчыкі гэтага гармону ў мужчынскім арганізме, тым вышэйшая верагоднасць смерці ад названых хваробаў.

Аднак жанчынам парада тайваньскіх сэксолагаў, на жаль, не падыходзіць. Паводле звестак, атрыманых у час даследаванняў нямецкіх вучоных, рэгулярны сэкс не лепшым чынам уплывае на працягласць жыцця жаночай палавіны: ён выклікае гарманальныя змены, прычым, хутчэй, неспрыяльныя.

## НА ПЕРШЫМ СПАТКАННІ ХЛУСЯЦЬ АМАЛЬ УСЕ

**Кінуць пыл у вочы на першым (і нават не толькі першым) спатканні — гэта звычайная справа, некаторымі ўшаноўваецца нават як мастацтва, высветлілі брытанскія вучоныя.**

Больш за ўсё як мужчыны, так і жанчыны схільныя перабольшваць свае подзвігі на рамантычнай ніве. На другім месцы — і гэта аказалася нечаканасцю — ступень начытанасці і адукаванасці. Падчас эксперыменту былі апытаны 1540 чалавек, з якіх 860 былі маладзей за 21 год.

На спатканнях тры з чатырох брытанцаў (74 працэнты), мякка кажучы, не зусім шчырыя ў тым, што датычыцца інтэлектуальнай «ежы». Прасцей кажучы, яны выдаюць жаданае за сапраўднае: напрыклад, не міргнуўшы вокам, скажуць, што з'яўляюцца гарачымі прыхільнікамі творчасці Шэкспіра (хоць апошні раз перачытвалі яго ў школе), будуць сцвярджаць, што з нецярпеннем чакаюць выхаду літаратурных навінак (у той жа час не змогуць назваць і некалькіх сучасных пісьменнікаў), будуць пераконваць, што аддаюць перавагу часопісам пра тэатр і мастацтва (але насамрэч зачытваюцца не асабліва перагружанымі сэнсам глянцавымі выданнямі з агаленымі прыгажунямі на вокладках).

Пры гэтым як мужчыны так і жанчыны ў адным выпадку з пяці (18 працэнтаў) праводзяць «інтэлектуальную падрыхтоўку» да спаткання, імкнучыся пазнаць нешта, што, паводле іх меркавання, можа зацікавіць партнёра.

Першыя, часцей за ўсё, прабягаюць вачыма па паэтычных зборніках, разлічваючы вывучыць хоць пару рамантычных радкоў, каб зачараваць дзяўчыну. Другія зазіраюць на сайты навін (бо сучасная дзяўчына павінна ўмець падтрымаць гутарку на палітычную тэму ці паразважаць аб перспектывах эканамічнага крызісу) або завучваюць тэксты любімых песень.

І тыя, і другія лічаць выдатным манеўрам пакінуць на відным месцы кнігу, якая ўжо абмяркоўвалася раней з партнёрам, і тым самым павялічыць свае шанцы на працяг адносінаў.

## ЧАМУ МЫ НЕ МОЖАМ ВЫСПАЦЦА?

